WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ЧЭРВЕНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 109
(26973)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ ВІНШАВАННЕ КАЛЕКТЫВУ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «РЭСПУБЛІКА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне калектыву рэдакцыі газеты «Рэспубліка» з 20-годдзем выхаду ў свет першага нумара выдання.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гэтыя гады «Рэспубліка» заслужыла рэпутацыю саліднага і аўтарытэтнага выдання і сёння па праву ўваходзіць у лік лідзіруючых айчынных друкаваных СМІ.

«Нараўне з публікацыяй афіцыйных матэрыялаў вы нярэдка выступаеце ініцыятарамі грамадскага абмеркавання найбольш важных пытанняў эканамічнага развіцця краіны, аказваеце дзейную падтрымку дзяржаўнаму курсу па пабудове моцнай і квітнеючай Беларусі», — адзначаецца ў віншаванні.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што творчы патэнцыял калектыву газеты дасць магчымасць не толькі захаваць існуючыя прафесійныя традыцыі, але і яшчэ больш умацуе пазіцыі газеты ў медыясферы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАСЦЬ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЮ БЕЛАРУСКІМ ЖУРНАЛІСТАМ 17 ЧЭРВЕНЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка дасць планавую прэс-канферэнцыю беларускім цэнтральным і рэгіянальным СМІ ў пятніцу 17 чэрвеня. Аб гэтым паведаміў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў.

«Прэс-канферэнцыя прадугледжана паўгадавым графікам работы Прэзідэнта. Мы прапаноўвалі адмяніць яе або перанесці на некаторы час з улікам няпростай фінансава-эканамічнай сітуацыі, якую цяпер перажывае наша краіна. Аднак кіраўнік дзяржавы пакінуў гэта мерапрыемства ў сваім рабочым графіку і настроены на шчырую і сумленную размову з журналістамі», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў.

На сустрэчы з журналістамі Аляксандр Лукашэнка адкажа на самыя злабадзённыя пытанні, якія хвалююць грамадзян краіны.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ДЗМІТРЫЯ МЯДЗВЕДЗЕВА З ДНЁМ РАСІІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і ўсіх расіян з Днём Расіі.

«Гэта свята па праву стала сімвалам народнага адзінства і ўмацавання дзяржаўных асноў Расійскай Федэрацыі», — адзначыў у віншаванні кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

САЎМІН БЕЛАРУСІ ПРЫНЯЎ МЕРЫ ПА АБАРОНЕ СПАЖЫВЕЦКАГА РЫНКУ

Для забеспячэння эканамічнай стабільнасці дзяржавы і рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на дастойны ўзровень жыцця Савет Міністраў Беларусі прыняў некаторыя меры па абароне спажывецкага рынку. Аб гэтым гаворыцца ў пастанове № 755 ад 11 чэрвеня 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Як адзначылі ў прэс-службе, вываз фізічнымі асобамі з Беларусі за межы Мытнага саюза тавараў звыш устаноўленых норм дапускаецца пры ўмове выплаты спецыяльнага збору ў памеры двухразовай сярэдняй цаны вызначаных тавараў. Таксама ўстаноўлена абмежаванне на продаж аўтамабільнага паліва на аўтазаправачных станцыях у аб'ёме не больш як 200 л на адзін грузавы транспартны сродак. Пастановай забараняецца рэалізацыя тавараў фізічным асобам са складоў, баз, падсобных памяшканняў арганізацый.

Дакументам зацверджаны пералік тавараў і нормы іх вывазу, пры перавышэнні якіх неабходна выплаціць спецыяльны збор, а таксама пералік тавараў, часова забароненых да вывазу фізічнымі асобамі.

Спецыяльны збор выплачваецца пры вывазе свініны і мяса птушкі, цукру, мукі, сычужных сыроў (норма вывазу — 2 кг), масла (1 кг), тытунёвых вырабаў беларускай вытворчасці (2 пачкі), кансерваў мясных і малочных (5 бляшанак).

У пералік тавараў, часова забароненых да вывазу фізічнымі асобамі, увайшлі бытавыя халадзільнікі і маразільнікі вытворчасці ЗАТ «Атлант», газавыя пліты (беларуска-расійскае сумеснае прадпрыемства «Брэстгазаапарат»), цэмент (ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», РУП «Беларускі цэментны завод», РУП «Крычаўцэментнашыфер»), сінтэтычныя мыйныя сродкі (ААТ «Бархім»), крупы (у асартыменце) і макаронныя вырабы незалежна ад арганізацыі-вытворцы.

У адпаведнасці з пастановай плацельшчыкамі спецыяльнага збору з'яўляюцца грамадзяне Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія ажыццяўляюць дзейнасць, накіраваныя на вываз з Беларусі за межы Мытнага саюза тавараў, адносна якіх устаноўлены спецыяльны збор, любым спосабам, уключаючы перасылку ў паштовых адпраўленнях. Спецыяльны збор выплачваецца да вывазу тавараў з Беларусі ў беларускіх рублях або замежнай валюце па курсу Нацбанка, устаноўленаму на дату яго выплаты, і залічваецца ў рэспубліканскі бюджэт. Кантроль за выплатай спецыяльнага збору ўскладзены на Дзяржаўны мытны камітэт і Дзяржпагранкамітэт.

Міністэрству эканомікі даручана праводзіць маніторыг цэн на тавары, уключаныя ў пералік, рэгуляваць нормы іх вывазу фізічнымі асобамі, пры перавышэнні якіх выплачваецца спецыяльны збор, а таксама вызначаць сярэднюю цану тавараў і штодзённа даводзіць яе да зацікаўленых. Міністэрству фінансаў даручана вызначыць рэквізіты рахункаў і коды бюджэтнай класіфікацыі для выплаты спецыяльнага збору.

Нацыянальнаму банку прапанавана прыняць меры па падтрыманні рэальных працэнтных ставак па дэпазітах фізічных асоб у беларускіх рублях на дадатным узроўні, які забяспечвае гарантаваную даходнасць зберажэнняў насельніцтва ў банкаўскай сістэме і іх большую прывабнасць у параўнанні з альтэрнатыўнымі напрамкамі выкарыстання грашовых сродкаў.

У БЕЛАРУСІ ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ДЛЯ СТАБІЛІЗАЦЫІ АБСТАНОЎКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АЎТАМАБІЛЬНАГА ПАЛІВА

У Беларусі прыняты меры па стабілізацыі абстаноўкі па рэалізацыі аўтамабільнага паліва на ўнутраным рынку, а таксама па недапушчэнні незаконнага вывазу з тэрыторыі краіны тавараў, што выкарыстоўваюцца для камерцыйных мэт пад выглядам тавараў для асабістага карыстання. На гэта накіравана пастанова Саўміна № 753 ад 10 чэрвеня 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Дакумент уступіў у сілу 11 чэрвеня. Як адзначана ў пастанове, да тавараў для асабістага карыстання, вывозімых з тэрыторыі Беларусі фізічнымі асобамі за межы мытнай тэрыторыі Мытнага саюза, не адносіцца аўтамабільнае паліва ў выпадку выезду фізічнай асобы на транспартным сродку больш як адзін раз на працягу пяці сутак.

Гэта палажэнне не распаўсюджваецца на супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх устаноў, міжнародных арганізацый, прадстаўніцтваў гэтых арганізацый і членаў іх сем'яў; а таксама на фізічных асоб, якія працуюць у дзяржорганах і іншых дзяржаўных арганізацыях, ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, фінансавых расследаванняў, якія накіроўваюцца ў службовыя камандзіроўкі за мяжу.

СТАР. 2

УЛАДЗІМІР МАКЕЙ НАЗВАЎ АБСАЛЮТНАЙ БЯЗГЛУЗДЗІЦАЙ ПАВЕДАМЛЕННІ РАСІЙСКІХ СМІ АБ УВЕДЗЕНЫХ АДНОСНА ІХ АБМЕЖАВАННЯХ З БОКУ БЕЛАРУСКІХ УЛАД

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей назваў абсалютнай бязглуздзіцай паведамленні расійскіх СМІ аб нібыта ўведзеных адносна іх абмежаваннях з боку беларускіх улад. Такім чынам, адказваючы на пытанне БЕЛТА, ён пракаментаваў інфармацыю аднаго з вядучых расійскіх інфармагенцтваў, якому ананімна заявілі, што «такое рашэнне беларускіх улад ускладніць крэдытаванне Беларусі з боку Расіі».

«Гэта ўжо стала дрэннай традыцыяй з боку нашых сяброў. Чарговы раз неназваная асоба ў Крамлі інфармуе, дакладней — дэзінфармуе, грамадскасць аб тым, што хтосьці ў Беларусі робіць нешта дрэннае супраць Расіі, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — А пасля гэтага ідуць заявы ў духу адкрытага шантажу».

«Заўважце, і асоба хваецца за маскай, і канкрэтныя абмежавальныя меры не называюцца. Таму што іх і няма. Гэта — абсалютная бязглуздзіца», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Паводле яго слоў, сёння ў Беларусі бесперашкодна распаўсюджваюцца і працуюць усе расійскія СМІ. Адзінае патрабаванне — гэта выкананне беларускага заканадаўства. «Наадварот, з улікам нашых блізкіх адносін мы закрываем вочы на адкрытыя парушэнні шэрагам расійскіх СМІ беларускіх законаў, ды і проста чалавечай маралі і журналісцкай этыкі. Калі спатрэбіцца, мы можам абнародаваць канкрэтныя факты падрыхтоўкі некаторымі акрэдытаванымі ў Беларусі расійскімі СМІ негатыўных матэрыялаў аб нашай краіне па ўказаці зверху. Прычым з канкрэтнымі імёнамі», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Калі мы — сябры, то і размаўляць трэба непасрэдна адзін з адным адкрыта, прама і сумленна, а не хавацца за маскай і запускаць у прэсу дэзынфармацыю з элементамі адкрытага шантажу», — рэзюмаваў Уладзімір Макей.

Аляксей ШЫРМА:

«БЕЛАРУСЬ ВАЛОДАЕ ДАСТАТКОВЫМ ПАТЭНЦЫЯЛАМ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СВАЕ ПАТРЭБЫ ТОЛЬКІ ЗА КОШТ УЖО НАЯЎНЫХ ГЕНЕРАВАЛЬНЫХ КРЫНІЦ»

Сёння энергетыка з'яўляецца ключавой сістэмай, базавым элементам для стабільнай работы ўсіх без выключэння галін народнай гаспадаркі. Ужо каторы год беларускія энергетыкі не толькі надзейна забяспечваюць спажыўцоў, але і актыўна працуюць над удасканаленнем сістэмы. У іх актыве дзясяткі вытворчасцяў, пераведзеных з імпартнага на мясцовае паліва, у самых бліжэйшых планах — новыя гідраэлектрастанцыі і першыя ветракі. Напярэдадні прафесійнага свята беларускіх энергетыкаў аб дасягненнях і перспектывах айчыннай энергасістэмы «Звяздзе» расказаў генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга» Аляксей ШЫРМА.

— Прыярытэтам для беларускай энергасістэмы нязменна з'яўляецца надзейнае энергазабеспячэнне ўсіх галін эканомікі краіны і насельніцтва. Пры гэтым асноўная ўвага надаецца павышэнню эфектыўнасці вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі, — адзначыў Аляксей Расціслававіч. — Апошняе дзесяцігоддзе адрознівалася высокімі тэмпамі абнаўлення абсталявання энергасістэмы за кошт значнага ўкладання сродкаў, у тым ліку замежных інвестараў, і выкананне энергазберагальных мерапрыемстваў.

Толькі ў 2010 годзе з улікам падпісаных крэдытных дамоў прыцягнута замежных інвестыцый у памеры $1 млрд. Гэта даволі вядомыя праекты: рэканструкцыя Гродзенскай ЦЭЦ-2 за кошт крэдыту Эксімбанка Індыі, будаўніцтва Полацкай ГЭС на Заходняй Дзвіне за кошт пазыковых сродкаў Еўразійскага банка развіцця, а таксама рэканструкцыя Бярозаўскай і Лукомльскай ДРЭС за кошт кітайскіх крэдытаў. Такім чынам, летась зроблены значны зачын для выканання інвестыцыйных праграм гэтага года. Сёлета ў адпаведнасці з планамі ўрада дзейнасць ДВА «Белэнерга» будзе, найперш, накіравана на прыцягненне прамых інвестыцый. Зараз кола краін, з якімі мы працуем, досыць шырокае: Расія, Украіна, Чэхія, Германія, Фінляндыя, Славенія, Кітай, Індыя і іншыя. Сфарміраваны пералік інвестпраектаў, адпаведныя прапановы разасланы больш як 60 інвестарам.

Наогул жа замежнапалітычны вектар «Белэнерга» ў 2010 годзе пашырыўся, з'явіліся новыя накірункі супрацоўніцтва. Гэта Венесуэла, Куба, Катар, Сірыя, Іран, Ірак, Ліван... Падчас візітаў беларускіх энергетыкаў у гэтыя краіны прапрацоўваліся пытанні ўдзелу арганізацый будаўніча-мантажнага комплексу «Белэнерга» ў будаўніцтве новых і мадэрнізацыі дзейсных аб'ектаў электраэнергетыкі новых партнёраў.

— Якія значныя энергааб'екты ўдалося ўвесці ў эксплуатацыю за апошнія гады? Якія ўвойдуць у энергасістэму краіны ўжо сёлета?

— У ліку значных аб'ектаў Мінская ЦЭЦ-3, дзе была ўведзена ў эксплуатацыю парагазавая ўстаноўка магутнасцю 230 МВт. Акрамя таго, была завершана рэканструкцыя трэцяга энергаблока на Бярозаўскай ДРЭС, што дазволіла павялічыць магутнасць станцыі на 65 МВт. На Лукомльскай ДРЭС былі мадэрнізаваны першы, другі і чацвёрты энергаблокі, што дало прырост магутнасці станцыі на 57,5 МВт. Таксама выканана рэканструкцыя турбаагрэгата на Гродзенскай ЦЭЦ-2, магутнасць станцыі вырасла на 10 МВт.

АСНОЎНАЯ ЎВАГА СЁННЯ — ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦІ

У 2009 годзе была ўведзена ў эксплуатацыю кагенерацыйная газапаршневая ўстаноўка магутнасцю 26,1 МВт на жлобінскай кацельні.

Што да энергакрыніц на мясцовых відах паліва, то ў 2006 годзе ўведзена ў эксплуатацыю міні-ЦЭЦ на драўняных адходах у Асіповічах, у 2007 годзе — міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва ў Вілейцы. Акрамя таго, у 2009 годзе была запушчана міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва ў Пружанах. Яе магутнасць складае 3,7 МВт, і гэта шмат у чым паказальны аб'ект беларускай энергасістэмы. 29 красавіка 2011 года ўведзена ў эксплуатацыю ветраэнергетычная ўстаноўка магутнасцю 1,5 МВт у вёсцы Грабнікі Навагрудскага раёна.

Усяго ж з 2005 па 2010 год у ДВА «Белэнерга» ўведзены генеравальныя крыніцы (з улікам уводу магутнасцяў на дзейсных электрастанцыях) агульнай магутнасцю 471,45 МВт. Гэта дазволіла зменшыць знос асноўных фондаў, удзельны выдатак паліва на адзінку прадукцыі і павялічыць эфектыўнасць вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі.

Безумоўна, праца па будаўніцтве і мадэрнізацыі генеравальных крыніц будзе працягнута. Так, мы разлічваем увесці ў эксплуатацыю парагазавую ўстаноўку магутнасцю 400 МВт на Мінскай ЦЭЦ-5, завяршыць будаўніцтва міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва ў Рэчыцы. Акрамя таго, павінны ў 2011 годзе ўвесці ў эксплуатацыю дзве парагазавыя ўстаноўкі на Мінскай ЦЭЦ-2, а на Віцебскай ЦЭЦ будзе заменена турбіна.

У ліку буйных праектаў — мадэрнізацыя пятага блока на Бярозаўскай ДРЭС і будаўніцтва Гродзенскай ГЭС, якое мы разлічваем завяршыць сёлета. У цэлым прырост генеравальных магутнасцяў прагназуецца па выніках года ў аб'ёме 520 МВт.

— Ну і крыху аб планах...

— Што да планаў на найбліжэйшыя 5 гадоў, то інвестыцыі ў развіццё энергасістэмы павінны скласці каля $6 млрд — гэта з улікам прамых інвестыцый. За гэты час «Белэнерга» разлічвае ўвесці ў эксплуатацыю каля 3,2 тыс. МВт новых магутнасцяў.

Так, мы плануем працягнуць мадэрнізацыю і развіццё асноўных кандэнсацыйных электрастанцый — Лукомльскай і Бярозаўскай ДРЭС, будзем займацца мадэрнізацыяй Мінскай ЦЭЦ-5, Віцебскай, Навапалацкай ЦЭЦ і Бабруйскай ЦЭЦ-2. У цэлым мы разлічваем дзякуючы гэтым мерапрыемствам зменшыць удзельны выдатак паліва ў энергасістэме на 10%.

У мэтах дыверсіфікацыі паліўна-энергетычнага балансу энергасістэмы плануецца будаўніцтва да 2015 года вугальнай электрастанцыі ў Зэльве, міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва, гідраэлектрастанцый, ветракоў.

У рамках рэалізацыі дзяржпраграмы будаўніцтва энергакрыніц на мясцовых відах паліва ў 2010—2015 гадах прадугледжваецца будаўніцтва 161 такой крыніцы сумарнай электрычнай магутнасцю каля 48 МВт і цеплавой магутнасцю да 1026 МВт. Акрамя таго, у 2011–2015 гадах прадугледжваецца будаўніцтва ГЭС магутнасцю каля 103 МВт, у тым ліку дзвюх ГЭС на рацэ Заходняя Дзвіна сумарнай магутнасцю 61 МВт (Полацкая і Віцебская) і дзвюх — на рацэ Нёман сумарнай магутнасцю 37 МВт (Гродзенская і Нёманаўская).

Цяпер Беларусь валодае дастатковым патэнцыялам, каб забяспечыць свае патрэбы толькі за кошт ужо наяўных генеравальных крыніц, прычым за папярэднія 5 гадоў мы змаглі скараціць знос асноўных вытворчых фондаў энергасістэмы на 9,5%. Разам з тым, штогод імпартуецца да 5 млрд кВт/г з Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі ў мэтах загрузкі толькі найбольш эфектыўных магутнасцяў і з улікам правядзення рамонту электрастанцый.

Прагназуецца, што ў 2015 годзе за кошт павелічэння аб'ёмаў выкарыстання мясцовых відаў паліва і ўзнаўляльных крыніц энергіі доля ўласных энергарэсурсаў у балансе кацельна-пячнога паліва складзе не менш за 30%, а ў 2020 годзе — не менш за 32%.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ, РАБОТНІКІ І ВЕТЭРАНЫ БЕЛАРУСКАЙ ЭНЕРГАСІСТЭМЫ!

Беларуская энергасістэма прайшла складаны і славуты 80-гадовы шлях. На пачатку 20-га стагоддзя закладваўся падмурак беларускай энергетыкі. У пасляваенныя гады энергетыка, як і ўся народная гаспадарка Беларусі, аднаўлялася літаральна з нуля. У цяжкія 90-я гады, гады дзяржаўнай перабудовы, Беларуская энергасістэма працягвала развівацца і надзейна забяспечваць спажыўцоў электрычнай і цеплавой энергіяй.

Дзякуючы прафесіяналізму, найвышэйшай ступені адказнасці і энтузіязму ўсіх пакаленняў энергетыкаў, беларуская энергасістэма сёння з'яўляецца магутным вытворча-тэхналагічным комплексам, які мае найважнейшае значэнне для дынамічнага і ўстойлівага развіцця краіны. Нашы адмыслоўцы карыстаюцца заслужанай павагай і аўтарытэтам як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і за яе межамі.

У рамках рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны да 2015 года перад энергетыкамі Беларусі пастаўлены вельмі складаныя і маштабныя задачы па забеспячэнні энергетычнай бяспекі і павышэнні энергетычнай незалежнасці краіны, у тым ліку за кошт мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў і энергазберажэння ва ўсіх сферах — ад вытворчасці да спажывання энергіі, будаўніцтва і ўводу генеравальных магутнасцяў малой энергетыкі, якія працуюць на мясцовых відах паліва, узнаўляльных крыніц энергіі.

Выкананне вызначаных планаў патрабуе велізарных капітальных выдаткаў, мабілізацыі ўсіх наяўных рэсурсаў. Найважнейшая роля ў гэтых працэсах належыць энергетыкам: кіраўнікам і адмыслоўцам, работнікам галіновых органаў кіравання, энергазабяспечвальных, рамонтных і наладачных арганізацый, прадпрыемстваў будаўніча-мантажнага комплексу.

Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што энергетыкі вырашаюць самыя складаныя вытворчыя, тэхнічныя, эканамічныя і сацыяльныя пытанні, спрыяюць умацаванню і развіццю энергетычнага патэнцыялу рэспублікі.

Напярэдадні свята, паважаныя калегі, прыміце шчырыя віншаванні з 80-гадовым юбілеем Беларускай энергасістэмы, пажаданні моцнага здароўя і шчасця, дабра і дабрабыту, працоўных поспехаў на карысць нашай Радзімы.

Генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга» А.Р. Шырма

80 БЕЛАРУСКАЯ ЭНЕРГАСІСТЭМА

ЗНАКАВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ АЙЧЫННАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

Дырэктар Лукомльскай ДРЭС Аляксандр БАЗЫЛЕНКА:

«МЫ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ ПЕРШАПРАХОДЦАМІ»

Днямі спаўняецца 80 гадоў, як функцыянуе ўнікальная энергетычная гаспадарка — Беларуская энергетычная сістэма. У свой час яна прадаставіла магчымасць укаранення навукова-тэхнічнага прагрэсу і перадавых тэхналогій, якія кардынальна змянілі не толькі жыццядзейнасць чалавека, вытворчасць, але і знешні выгляд нашай краіны. Флагманам электраэнергетыкі краіны па праве лічыцца ордэна «Знак Пашаны» Лукомльская ДРЭС — буйнейшая на сёння крыніца энергіі ў Беларусі. Намінальная магутнасць электрастанцыі — 2459,5 МВт, што складае звыш 30 працэнтаў устаноўленай магутнасці ўсёй энергасістэмы рэспублікі. У перыяды найбольшай загрузкі Лукомльская ДРЭС вырабляе каля 50 працэнтаў усёй электраэнергіі краіны. Да таго ж станцыя ў Віцебскай вобласці застаецца адной з самых надзейных і эканамічных кандэнсацыйных электрастанцый Беларусі і Расіі.

Лукомльская ДРЭС з'яўляецца філіялам РУП «Віцебскэнерга» ДВА «Белэнерга».

Блочны шчыт кіравання.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Прафесію энергетыка Аляксандру Базыленку прадвызначыў сам лёс. Па-першае, нарадзіўся Аляксандр Анатольевіч у гарадскім пасёлку Арэхаўск — не проста прыгожым месцы на беразе маляўнічага возера. У Арэхаўску знаходзіцца Беларуская ДРЭС, якая і паклала пачатак усёй энергетыцы Беларусі.

Будаўніцтва станцыі пачалося ў далёкім 1930 годзе. Удзел у ім браў і дзед Аляксандра Базыленкі, які потым застаўся працаваць на станцыі. У свой час працаваць на ДРЭС прыйшоў і бацька Аляксандра Анатольевіча. Працавала тут і маці. Таму, калі пасля школы надышоў час вызначацца з будучай прафесіяй, Аляксандр без сумненняў падаў дакументы ў Беларускі політэхнічны інстытут (зараз БНТУ). Пасля завяршэння вучобы па спецыяльнасці «Цеплавыя станцыі» ён як патрапіў па размеркаванні на Лукомльскую ДРЭС, так да гэтага часу там і працуе. Прайшоў фактычна ўсе прыступкі прафесійнай ды і кар'ернай лесвіцы. Пачынаў як машыніст-абходчык па кацельным, турбінным абсталяванні, потым — машыніст блока, старшы машыніст блока, старшы машыніст цэха, начальнік цэха КТЦ, начальнік змены станцыі, намеснік галоўнага інжынера па мадэрнізацыі, галоўны інжынер, дырэктар.

Сам Аляксандр Анатольевіч мяркуе, што пасада дырэктара станцыі большы ўхіл мае ў эканоміку, аднак веды, тэхнічны багаж і практычны вопыт дазваляюць трымаць руку на пульсе. «Бо без надзейнай работы тэхнічнай часткі не будзе і эканамічных паказчыкаў», — перакананы Аляксандр Базыленка.

— ЛУКОМЛЬСКАЯ ДРЭС сёння — гэта, з аднаго боку, тыя ж восем энергаблокаў, якія былі пабудаваны 40 гадоў таму. Але гэта калі гаварыць толькі пра колькасць. Калі ж улічваць якасныя характарыстыкі, то гэта зусім новая станцыя з максімальна аптымізаваным абсталяваннем.

З васьмі энергаблокаў першыя чатыры перажылі глыбокую мадэрнізацыю. Заменены праточныя часткі паравых турбін (у прыватнасці, статарныя часткі генератара, ротары), рэканструявана дапаможнае абсталяванне блокаў... Гэтыя і іншыя захады дазволілі не толькі падоўжыць тэрмін службы энергаблокаў яшчэ на 40 гадоў, але і павялічыць намінальную магутнасць кожнага блока з 300 да 315 МВт. Безумоўна, і да гэтага нам удавалася перагружаць блокі і «выціскаць» з іх да 330 МВт. А гэта 240 МВт па станцыі! Такое стала магчыма ў першую чаргу дзякуючы прафесіяналізму калектыву, які працаваў на той час.

СТАР. 4-5

ISSN 1990 - 763X

Юбілей айчыннай энергасістэмы — гэта нагода азірнуцца назад, ацаніць зробленае, перажытае і зазірнуць наперад. Уся гісторыя Лукомльскай станцыі складаецца з некалькіх этапаў. Першы этап — гэта будаўніцтва станцыі, засваенне абсталявання і вывядзенне ДРЭС на праектную магутнасць. Другі этап — работа над зніжэннем удзельнага расходу паліва з выкананнем элементаў мадэрнізацыі. Трэці этап, які мы ўжо завяршаем, — глыбокая мадэрнізацыя праточных частак турбін, катла і г.д. Чацвёрты этап, які яшчэ наперадзе, — будаўніцтва парагазавай устаноўкі. Усё гэта стала магчымым дзякуючы намаганням калектыву высокіх прафесіяналаў і аднадумцаў. Першыя работнікі станцыі з'ехаліся ў Новалукомль з усіх куточкаў былога СССР. І гэты горад, наша станцыя сталі іх другой радзімай, другім домам. Зараз на ДРЭС прыйшло працаваць новае пакаленне энергетыкаў. Аднак работа ў калектыве наладжана так, што гісторыя станцыі, яе традыцыі, патрабаванні становяцца важнымі і для моладзі.

Напярэдадні юбілею энергасістэмы Беларусі ўсяму калектыву Лукомльскай ДРЭС — і ветэранам, і сённяшнім работнікам, і маладым спецыялістам — хачу выказаць словы ўдзячнасці і павіншаваць са святам. Гэта наша агульнае свята! Усім нам хачу пажадаць, па-першае, справіцца з пастаўленымі задачамі, рэалізаваць намечаныя планы, заўсёды адпавядаць патрабаванням часу, памятаць, што са станцыяй непарыўна звязана жыццё ўсяго горада. Сёння мы ўжо разумеем: рост немагчымы без далейшых пераўтварэнняў. Будаўніцтва ПГУ — новы этап рэфармавання энергетыкі краіны. Нам пашчасціла працаваць у гэты складаны і цікавы перыяд пераўтварэнняў. Відавочна, што маштабныя пераўтварэнні ў электраэнергетыцы паслужаць пачаткам якаснага абнаўлення і далейшага развіцця айчыннай эканомікі. Я перакананы: новалукомльцы справяцца з усімі пастаўленымі перад імі задачамі.

Ад імя работнікаў станцыі хачу павіншаваць нашых калег з «Віцебскэнерга», іншых аб'яднанняў. Мы робім агульную вельмі важную справу. Я жадаю ўсім калегам прафесійных дасягненняў, рэалізацыі ўсіх намечаных планаў, удачы, аптымізму, выдатнага здароўя і перакананасці ў правільнасці абранага курсу! Няхай вашай надзейнай апорай у жыцці застаюцца сям'я, родныя і сябры, а святло і цеплыня заўсёды саграваюць ваш дом!

Дырэктар Лукомльскай ДРЭС Аляксандр БАЗЫЛЕНКА

БЕЛАРУСЬ АБАРОНІЦЬ СВОЙ УНУТРАНЫ РЫНАК УВЯДЗЕННЕМ ПОШЛІН І ЗБОРАЎ ПРЫ ВЫВАЗЕ САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНЫХ ТАВАРАЎ ЗА МЕЖЫ МЫТНАГА САЮЗА

Беларусь увядзе абмежавальныя меры для прадухілення спекуляцыйнага вывазу ў суседнія краіны сацыяльна значных тавараў. Гэта пытанне абмяркоўвалася 10 чэрвеня ў ходзе рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Леанідам Мальцавым. На сустрэчы таксама прысутнічала кіраўніцтва Дзяржаўнага мытнага і Дзяржаўнага пагранічнага камітэтаў.

Кіраўнік дзяржавы засяродзіў увагу на праблеме актыўнага вывазу ў сумежныя краіны сацыяльна значных тавараў, у тым ліку аўтамабільнага паліва, прадуктаў харчавання, на якія цэны ў Беларусі значна ніжэйшыя, чым у суседзяў. «Таму, зразумела, ствараецца не проста пагроза, а мы назіраем неарганізаваны, ва ўрон нашым таваравытворцам вываз гэтай прадукцыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, калі дзейнічаць рыначнымі мерамі, то трэба было б істотна ўзняць цэны на ўнутраным рынку, што ў цяперашняй сітуацыі немагчыма. «Таму вымушаная, але, на жаль, мера неабходная, якую трэба прыняць — спыніць несанкцыянаваны спекуляцыйны вываз з Беларусі тавараў за межы краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым ён падкрэсліў, што забараняць вываз тавараў не плануецца: «Напрыклад, калі вязець паліва ў Літву, заплаці экспартную пошліну на гэты бензін або нафту, або дызпаліва і вязі, калі ласка — ніхто не супраць».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што напярэдадні даручыў выпрацаваць комплекс мер і ўжо з заўтрашняга дня пачаць іх рэалізацыю па спыненні спекуляцыйнага вывазу прадукцыі. Пры гэтым у адносінах да парушальнікаў Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў дзейнічаць самым сур'ёзным чынам: «Меры прымайце любыя, аж да канфіскацыі маёмасці, якой яны карыстаюцца для вывазу гэтых прадуктаў (аўтамабіль, каляска, конь і г.д.). Нельга — значыць нельга».

«Прыняты рашэнні, і гэтыя рашэнні ўжо прымяняюцца на практыцы. Пры вывазе за тэрыторыю Мытнага саюза аўтамабільнага паліва і іншых сацыяльна значных тавараў, на якія існуе розніца цэн, будуць прымяняцца адпаведныя пошліны або зборы, якія будуць кампенсаваць гэту розніцу цэн», — паведаміў Леанід Мальцаў.

«Гэта агульнасусветная практыка абароны ўнутранага рынку ў інтарэсах сваіх грамадзян», — адзначыў Дзяржсакратар.

Ён таксама асабліва падкрэсліў, што ўсе абмежаванні будуць уводзіцца ў строгай адпаведнасці з абавязацельствамі, якія прыняла на сябе Беларусь у рамках міжнародных дамоўленасцяў, і будуць мець часовы характар.

У БЕЛАРУСІ ПАШЫРАЮЦЦА МЕРЫ ПА ПАДТРЫМЦЫ МАЛОГА І СЯРЭДНЯГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

Адпаведны ўказ № 241 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 сакавіка 1998 года № 136 і ад 21 мая 2009 года № 255» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 10 чэрвеня.

Дакумент накіраваны на ўдасканаленне парадку аказання дзяржаўнай фінансавай падтрымкі суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, якая ажыццяўляецца ў рамках праграм дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва.

Указам прадастаўлена права аказваць дзяржаўную фінансавую падтрымку суб'ектам малога прадпрымальніцтва разам з банкамі і Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў таксама і гарадскім, раённым выканкамам і (або) мясцовым адміністрацыям па рашэнні аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама.

Пералік напрамкаў, на якія суб'ектам малога прадпрымальніцтва прадастаўляецца дзяржаўная фінансавая падтрымка, дапоўнены такімі, як будаўніцтва, набыццё будынкаў, збудаванняў, ізаляваных памяшканняў і (або) іх рамонт і рэканструкцыя, набыццё транспартных сродкаў.

Прадугледжана магчымасць прадастаўлення суб'ектам малога прадпрымальніцтва льготных мікракрэдытаў без падрыхтоўкі імі інвестыцыйных праектаў, а таксама спрошчаны ўмовы для звароту суб'ектаў малога прадпрымальніцтва па дзяржаўную фінансавую падтрымку.

Указам пашыраны пералік напрамкаў для прадастаўлення субсідый суб'ектам інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (цэнтрам падтрымкі прадпрымальніцтва, інкубатарам малога прадпрымальніцтва).

Так, прадугледжана магчымасць прадастаўлення субсідый для будаўніцтва, набыцця будынкаў, збудаванняў, ізаляваных памяшканняў і (або) іх рамонту і рэканструкцыі, арганізацыі доступу да сетак электрасувязі і (або) глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт і іншых, правядзення і (або) удзелу ў навучальных курсах, распрацоўкі праектнай дакументацыі.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Падпольны склад ГЗМ

Больш за 300 літраў бензіну зрабіў спробу вывезці на тэрыторыю Украіны непрацуючы жыхар аднаго з райцэнтраў Гомельскай вобласці. Аўтамабільнае паліва ён перавозіў у каністрах рознай ёмістасці, якія знаходзіліся ў багажніку і салоне асабістага аўтамабіля. Па словах затрыманага 32-гадовага грамадзяніна, бензін ён набыў на аўтазаправачных станцыях па месцы жыхарства з мэтай далейшага перапродажу ў суседняй краіне.

У прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці таксама паведамілі, што ў сувязі з прыняццем пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых мерах па абароне спажывецкага рынку» работа па выяўленні асоб, якія парушаюць заканадаўства, вядзецца ў розных напрамках. Напрыклад, адначасова быў выяўлены падпольны склад гаруча-змазачных матэрыялаў у адным з райцэнтраў Гомельшчыны. Перавалачны пункт для захоўвання і перапраўкі паліва быў абсталяваны ў гаражы. Па папярэдняй інфармацыі, дызельнае паліва скуплялася на аўтазаправачных станцыях, а таксама ў працаўнікоў розных прадпрыемстваў і арганізацый. Потым вадкасць разлівалася ў тару з мэтай далейшага перапродажу за мяжой. Між іншым, арганізацыя такога склада ў гаражным кааператыве магла прывесці да надзвычайнага здарэння і прычыніць шкоду жыццю і здароўю грамадзян. На фактах праводзіцца праверка. Пры пацвярджэнні парушэння аб спекуляцыі ГЗМ на тэрыторыі сумежнай дзяржавы будуць прыняты меры адміністрацыйнага рэагавання аж да канфіскацыі транспартнага сродку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.06.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	4 982,00	1 чэшская крона	296,55
▼ 1 еўро	7 154,15	1 польскі злоты	1 818,65
1 латвійскі лат	10 090,13	▲ 1 расійскі рубель	179,27
1 літоўскі літ	2 071,60	1 украінская грыўня	623,72

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	27,7907
10 UAH	34,7949
10000 BYR	55,9507
EUR	40,2298

З КАЛІНІНГРАДА Ў БРЭСТ — САМАЛЁТАМ

У мінулую пятніцу ў аэрапорце «Брэст» сустракалі першы авіярэйс з расійскага Калінінграда. У гэты ж дзень паветранае судна павезла пасажыраў з Брэста ў горад на Балтыйскім моры. Па панядзелках і пятніцах рэйсы будуць пастаяннымі на летні перыяд. На гэтым кірунку выкарыстоўваюцца самалёты CRJ-100\200 кампаніі «Белавія», якія дазваляюць браць на борт 50 пасажыраў. Працягласць палёту складае 1 гадзіну 15 мінут. Білет эканом-класа ў адзін бок каштуе прыкладна 70 еўра. Зараз гэты кошт набліжаецца да цаны чыгуначнага білета, пры тым адпадае патрэба плаціць за транзітную літоўскую візу.

Пакуль што паветраны маршрут карыстаецца попытам у пасажыраў. Надалей супрацоўнікі брэсцкага аэрапорта не бяруцца рабіць прагнозы.

Яна СВЕТАВА.

ОАО «КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ»

(место нахождения: г. Витебск, проспект генерала Людникова, 10) извещает акционеров о проведении 15 июня 2011 года в 9.00 по адресу: г. Витебск, проспект генерала Людникова, 10 (помещение в читальном зале библиотеки) по инициативе директора ОАО «Красный Октябрь» внеочередного общего собрания акционеров со следующей повесткой дня:

1. О совершении ОАО «Красный Октябрь» крупной сделки с ОАО «Белгазпромбанк».
2. О наделении директора ОАО «Красный Октябрь» полномочиями на совершение ОАО «Красный Октябрь» крупной сделки с ОАО «Белгазпромбанк».

С документами по вопросам повестки дня можно ознакомиться в помещении читального зала ОАО «Красный Октябрь» с 14 июня 2011 года в рабочие дни с 13.00 до 17.00.

Регистрация участников внеочередного общего собрания акционеров будет проводиться 15 июня 2011 года с 8.30 до 9.00 в помещении библиотеки ОАО «Красный Октябрь» на основании документа, удостоверяющего личность, или доверенности.

Список акционеров, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 14 июня 2011 года.

Справки по телефону в г. Витебске: 8 0212 24 73 18. УНП 300003144

Уважаемые акционеры ОАО «Лидсельмаш»

24 июня 2011 года состоится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70, конференц-зал.

Повестка дня собрания:

1. О выплате дивидендов по итогам работы Общества за 2010 год.

Начало работы собрания **в 16.00.**
Регистрация участников собрания **с 15.00 до 15.50.**

Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш». УНП 500021638

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН серии ПТ № 0492005, формы 2РП, 2РН серии БА № 0028204, № 0061440 считать недействительными. *УНП 100357923*

ВУП Беларусі за студзень—май узрос на 12,5 працэнта

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі за студзень—май 2011 года ў супастаўных цэнах узрос і склаў 112,5 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Пры гэтым у сферы вытворчасці рост ВУП склаў 113 працэнтаў, у сферы паслуг — 111,1 працэнта. Гэта дынаміка вышэйшая за гадавыя прагнозныя паказчыкі. У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2011 годзе рост ВУП павінен скласці да ўзроўню 2010 года 109-110 працэнтаў.

Вытворчасць прамысловай прадукцыі за пяць месяцаў узрасла на 12,5 працэнта і склала Br90 трлн (гадавы прагноз росту — на 9-9,5 працэнта). Удзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі склала 12,7 працэнта, што ўвахоцзіць у межы гадавога прагнознага паказчыка — 12-13 працэнтаў.

Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал у студзені—маі гэтага года склаў 131 працэнт да аналагічнага ўзроўню мінулага года пры гадавым прагнозе 116-117 працэнтаў.

У Беларусі спынена новае льготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва

У Беларусі на няпэўны тэрмін прыпынена новае льготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва па стаўках да 5% гадавых, на долю якога традыцыйна прыпадала больш за палову фінансавання жыллёвага будаўніцтва, паведамілі агенцтву «Інтэрфакс-Захад» у Нацбанку Беларусі са спасылкай на рашэнні двух дзяржбанкаў (Беларусбанка і Белагапрамбанка), якія з'яўляліся аператарамі па выдачы льготных крэдытаў.

У Беларусбанку агенцтву пацвердзілі, што з 1 чэрвеня гэтага года прыпынена выдача новых ільготных крэдытаў на будаўніцтва жылля, у тым ліку і арганізацыям-заказчыкам. Банк працягвае абслугоўваць толькі раней адкрытыя крэдытныя лініі.

МВФ ГАТОВЫ АКАЗАЦЬ БЕЛАРУСІ ФІНАНСАВУЮ ПАДТРЫМКУ

Пра гэта на брыфінгу заявіў кіраўнік місіі Міжнароднага валютнага фонду ў Рэспубліцы Беларусь Крыс ДЖАРВІС:

— Мы пачалі перамовы па магчымай новай праграме з МВФ. Перамовы толькі пачаліся, і нам трэба будзе прайсці доўгі шлях. Неабходна правесці далейшае абмеркаванне макраэканамічнай палітыкі, дамовіцца пра структурныя пераўтварэнні, каб забяспечыць эфектыўнасць прадпрыемстваў і фінансавай сістэмы, за кошт чаго ў далейшым можна выйсці на ўстойлівыя і высокія тэмпы росту, — сказаў Крыс Джарвіс.

— Самае галоўнае, дзяржаўныя органы павінны з усёй рашучасцю ісці на макраэканамічныя і структурныя пераўтварэнні, — працягвае ён. — Неабходна ўзгадніць сур'ёзныя меры ў галіне структурных пераўтварэнняў і макраэканамічнай палітыкі да пачатку рэалізацыі праграмы, каб дзяржава такім чынам прадэманстравала сваю рашучасць. Персанал МВФ працягне супрацоўніцтва з урадам і Нацыянальным банкам, каб прыйсці да дасягнення пагаднення і дамоўленасцяў, якія будуць працаваць на карысць народа Рэспублікі Беларусь.

Больш падрабязна наконт тэрмінаў і аб'ёмаў выдзялення фінансавай дапамогі Крыс Джарвіс не сказаў, спаслаўшыся на пачатковую стадыю перамоў:

— Мы пакуль ні пра якія тэрміны не дамаўляліся. Але гаворка ідзе пра тое, што ў сённяшніх умовах неабходна дзейнічаць як мага хутчэй, каб дабіцца стабілізацыі становішча. Што тычыцца аб'ёмаў магчымай дапамогі, то ў рамках візіту істотных перамоў па гэтым пытанні не адбывалася. Гэта звязаны з тым, што аб'ём такой дапамогі будзе залежыць ад стану і патрэб плацежнага балансу Рэспублікі Беларусь, а таксама ад сур'ёзнасці тых мерапрыемстваў, якія будуць прадугледжаны праграмай. Зноў жа, мы не так далёка прасунуліся ў нашых перамовах, каб абмяркоўваць памеры ці аб'ёмы фінансавай дапамогі, — адзначыў ён.

Журналісты пацікавіліся, ці не стануць палітычныя ўмовы перашкодай для выдзялення фінансавай падтрымкі для нашай краіны, на што Крыс Джарвіс адказаў, што МВФ палітычных умоў не вылучае:

— Міжнародны валютны фонд не вылучае палітычныя ўмовы для сваіх крэдытаў. Мы стараемся падрыхтаваць па магчымасці самую лепшую эканамічную праграму і, у выпадку дасягнення дамоўленасці з прадстаўнікамі дзяржавы, прапануем гэтую праграму на зацвярджэнне выканаўчага савета МВФ, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы-члены МВФ. Я магу сказаць наступнае: калі праходзіла апошняе пасяджэнне выканаўчага савета па Рэспубліцы Беларусь і калі выканаўчыя дырэктары апошні раз выказвалі сваё меркаванне, яны заявілі, што гатовы будуць падтрымаць праграму, якая прадугледжвае сур'ёзныя эканамічныя і структурныя меры. Гэтае пасяджэнне адбылося ў сакавіку, з тых часоў пытанне аб Рэспубліцы Беларусь на пасяджэннях выканаўчага савета МВФ не ўздымалася, таму ніякай новай інфармацыі ў мяне няма.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Інфармацыя аб прымяненні міліцыяй слёзатачывага газу супраць удзельнікаў несанкцыянаванай акцыі ў «Брузгах» не адпавядае рэчаіснасці

Распаўсюджаная ў інтэрнэце інфармацыя аб тым, што нібыта міліцэйскі спецназ прымяняў слёзатачывы газ супраць удзельнікаў несанкцыянаванай акцыі 12 чэрвеня ў пункце пропуску «Брузгі», не адпавядае рэчаіснасці. Аб гэтым паведаміў журналістам часова выконваючы абавязкі па пасадзе начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Канстанцін Шалькевіч, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Як растлумачыў Канстанцін Шалькевіч, газ распыліў адзін з удзельнікаў несанкцыянаванага мерапрыемства. У выніку пацярпелі два чалавекі: супрацоўнік міліцыі і грамадзянская асоба. Абодва яны атрымалі хімічныя апёкі вачэй і былі шпіталізаваны. Асоба чалавека, які распыліў газ, пакуль не ўстаноўлена.

На гэты час праваахоўнікі затрымалі 22 удзельнікі згаданай несанкцыянаванай акцыі. Удакладняецца ступень іх дачынення да падзей на пункце пропуску «Брузгі». Прадстаўнік МУС сказаў, што гэта лічба не канчатковая, яна можа мяняцца як у бок змяншэння, так і ў бок павелічэння. Канчатковую ацэнку дзеяннямгэтых людзей дасць суд. У прыватнасці, будзе ўстанаўлівацца, з якой мэтай гэтыя людзі ехалі ў Польшчу.

Канстанцін Шалькевіч адзначыў, што пакуль не паступала заяў ад фізічных або юрыдычных асоб аб тым, што незаконная акцыя нанесла ім нейкі ўрон. «Але мы маем права ацаніць маральны ўрон, нанесены тым людзям, якія ў законным парадку хацелі перасекчы граніцу. Напэўна, нехта спазніўся на дзелавую сустрэчу або куды-небудзь яшчэ», — дадаў прадстаўнік МУС.

У БЕЛАРУСІ ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ДЛЯ СТАБІЛІЗАЦЫІ АБСТАНОЎКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АЎТАМАБІЛЬНАГА ПАЛІВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выключэннем з'яўляюцца і вадзіцелі аўтатранспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць міжнародныя перавозкі пасажыраў; фізічныя асобы, якія выязджаюць на лячэнне і (або) кансультацыю. Сюды ж адносяцца работнікі дзяржарганізацый краін — удзельніц Мытнага саюза, размешчаных на тэрыторыі замежных дзяржаў; а таксама фізічныя асобы, якія перасякаюць мытную граніцу МС у Беларусі на падставе працоўных віз, выдадзеных у дзяржавах — членах МС або замежных дзяржавах.

Усе гэтыя людзі абавязаны прад'яўляць на граніцы адпаведныя дакументы, якія пацвярджаюць іх статус.

Кантроль за выкананнем пастановы будуць забяспечваць дзяржаўныя мытны і пагранічны камітэты, а таксама МУС. Гэтым ведамствам таксама даручана сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і МНС праводзіць аператыўныя рэйды ў непасрэднай блізкасці ад пунктаў пропуску праз дзяржграніцу, каб выключыць несанкцыянаванае зліванне аўтамабільнага паліва ў прыдарожнай паласе. Парадак зліванне і захоўвання затрыманага аўтамабільнага паліва даручана вызначыць канцэрну «Белнафтахім» сумесна з МНС, ДМК, Дзяржпагранкамітэтам і МУС.

Прамая лінія

ХВАРОБЫ СКУРЫ: ЛЕЧЫМСЯ З РОЗУМАМ

Герпес, мікозы, псарыяз, атапічны дэрматыт — гэтыя і іншыя захворванні скуры не толькі непрыемныя і пагаршаюць якасць жыцця, яны яшчэ працягла лечацца і могуць прыносіць сур'ёзныя ўскладненні. Таму не варта адразу кідацца лячыць свае балячкі мазямі, якія актыўна рэкламуюцца, трэба абавязкова звяртацца па кансультацыю да спецыяліста.

У нашай чарговай «прамой лініі» возьме ўдзел урач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Іванавіч Яроміч.

«Прамая лінія» адбудзецца **СЁННЯ з 12.00 да 13.00** па нумарах **8 (017) 292 38 92** і **292 38 21**.

Здарэнне

ВЕЖА АБРЫНУЛАСЯ НА ЧАЛАВЕКА

Гаворка ідзе пра абрушванне воданапорнай вежы. Такое здарэнне адбылося каля 10.30 учора ў вёсцы Коранеўка Гомельскага раёна.

Па інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, траўмы рознай ступені цяжару атрымаў вадзіцель аднаго з мясцовых прадпрыемстваў. Як сведчаць відавочцы, пацярпелы прыехаў на тэрыторыю прадпрыемства, дзе і знаходзілася згаданая воданапорная вежа. Чалавек выйшаў з легкавога аўтамабіля і стаяў блізка ад яе. У гэты час вежа сама па сабе абрынулася. Відавочцы выцягнулі мужчыну з-пад рэшткаў будаўнічых канструкцый, яму аказалі першую медыцынскую дапамогу. Пазней пацярпелы быў шпіталізаваны. Вежа была павільённага тыпу, з металічным бакам і жалезабетоннымі сценамі, аб'ёмам 250 кубічных метраў, вышынёй 15 метраў. Пабудаваная яна была ў 1984 годзе. Зараз работнікі ЖКГ праводзяць работы па падключэнні спажыўцоў да вады ад свідравін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

Камітэт Дзяржбяспекі краіны выявіў і спыніў кантрабандны канал дастаўкі нафтапрадуктаў за межы Беларусі. Паліва перамяшчалася па старанна замаскіраваным самаробным трубаправодзе. Нафтапрадукты перапампоўваліся з тэрыторыі Беларусі ў адну з краін Балтыі. Праводзяцца мерапрыемствы па выяўленні асоб, якія мелі дачыненне да супрацьпраўнай дзейнасці.

У Пухавіцкім раёне на чыгуначным пераездзе загінулі хлопец і дзяўчына. Трагедыя здарылася ў 4 раніцы паблізу вёскі Талька. Маладыя людзі збіраліся перайсці чыгуначны пераезд, аднак не звярнулі ўвагі на цягнік, што набліжаўся, і трапілі пад састаў.

У суботу, 11 чэрвеня, каля 16 гадзін 30 хвілін у возеры ля вёскі Капачы пад Смаргонню захлынулася 43-гадовая жанчына, якая кінулася ў ваду ратаваць дзяцей. Вялікае і глыбокае возера Капачы знаходзіцца на тэрыторыі фермерскай гаспадаркі. У суботу жанчына, якая працавала ў жывёлагадоўлі гаспадаркі, са сваім мужам, дачкой, пляменнікам і яго сынам адпачывала на беразе. Дзеці, хлопчык з дзяўчынкай, плавалі на надзіманым матрацы. Раптам ветрам матрац стала адносіць у супрацьлеглы бок. Усе дарослыя кінуліся ў возера. Матрац з дзецьмі ўдалося прыцягнуць да берага. Выратаваць маці дзяўчынкі не здолелі.

У Івацэвічах кіроўца насмерць збіў падлетка і знік з месца ДТЗ. 12 чэрвеня каля 23.55 аўтамабіль «Фальксваген Гольф» ехаў па вул. Леніна і збіў пешахода на нерэгуляваным пераходзе. Пасля гэтага аўто знікла. Быў уведзены план «Перахоп», і ў 2.40 кіроўцу затрымалі. На той момант ён быў п'яны.

38-гадовы жыхар Смаргоні загінуў пад коламі грузавога цягніка Маладзечна-Кена. Інцыдэнт адбыўся ноччу на перагоне Залессе-Смаргонь.

Поўны абзац

Філіпінец Джунры Балуінг унесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як самы маленькі мужчына Зямлі. Рост 18-гадовага хлопца — 60 см. Па словах яго бацькоў, Джунры перастаў расці праз некалькі месяцаў пасля нараджэння. Прычыну гэтай з'явы выявіць не ўдалося. Джунры цяжка хадзіць, але, тым не менш, дапамагае бацькам па гаспадарцы. Цырымонія аб'яўлення Балуінга самым маленькім чалавекам адбылася ў дзень яго 18-годдзя. Прадстаўнікі Кнігі мяркуюць, што такім чынам будзе прыцягнута ўвага да праблем маленькага чалавека — сям'я рэкардсмена бедная і не можа забяспечыць яго неабходнымі лекамі.

У Швецыі ў бронзавага футбаліста скралі мяч. У горадзе Гетэборгу вандалы пашкодзілі помнік футбалісту Гунару Грэную — пераклілі статую, а таксама нейкім чынам аддзялілі ад яе бронзавы мяч. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, мяч бронзавага Грэна маглі скрасці падлеткі, якія адзначалі заканчэнне гімназіі непадалёк ад месца ўстаноўкі помніка. Пакуль выйсці на іх след не ўдалося. Мяч таксама дагэтуль не знойдзены. Між іншым, цяперашні інцыдэнт — не першы, які напаткаў помнік. У 2009 г. яго пераехала снегаўборачная машына.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

29 июня 2011 года в 14.00 ч. состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».

Собрание пройдет по адресу: **г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.**

Повестка дня собрания:

1. Увеличение Уставного Фонда Общества в пределах его чистых активов, путем увеличения номинальной стоимости акций ОАО «ДСТ-1, г. Витебск».

2. Утверждение изменений в устав ОАО «ДСТ-1, г. Витебск».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет) с 22 по 29 июня 2011 года (время работы с 8.30 ч. до 17.30 ч.), либо 29 июня 2011 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

Регистрация участников собрания **с 12.30 ч. до 13.45 ч.** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 29 июня 2011 года в 14.00 ч.

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию на 17 июня 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
УНП 300000398

УСЁ ВАКОЛ ДЗЯРЖАЎНАЕ?

За ноч рабочы КСУП «Ульянава», што ў Буда-Кашалёўскім раёне, разам з непрацуючым сябрам выкралі з поля ля вёскі Буда-Люшава 11 рулонаў сена. 4 мяшкі кукурузнага насення агульнай вагой амаль 68 кг сцягнула з поля ля вёскі Краўцоўка Гомельскага раёна раней судзімая супрацоўніца саўгаскамбіната «Сож». А вось у Калінкавіцкім раёне свае ж супрацоўнікі абакралі склад СВК «Ліпава» ў вёсцы Вязавіца. 200 кг насення кукурузы сталі іх здабычай. **Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Выезд грамадзян, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце пунктаў пропуску, будзе абмежаваны

Асобы, якія будуць перашкаджаць нармальнай рабоце пунктаў пропуску, транзітнаму руху на граніцы, будуць прыцягвацца не толькі да адміністрацыйнай адказнасці. Аб гэтым паведаміў журналістам прэс-сакратар Дзяржпагранкамітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка, перадае БЕЛТА.

Прадстаўнік пагранічнага ведамства растлумачыў, што выезд за мяжу гэтых грамадзян будзе абмяжоўвацца. Ён расказаў, што 12 чэрвеня на беларуска-польскай граніцы ў пункце пропуску «Брузгі» ў выніку несанкцыянаванай акцыі быў блакіраваны рух транспарту з 18.30 да 21.00. Каля 300 чалавек перашкаджалі руху з Беларусі ў Польшчу. У гэтым раёне знаходзілася 40 легкавых аўтамабіляў (частка без дзяржнумароў), якія належаць гэтым людзям. Былі затрыманы 15 удзельнікаў акцыі, а таксама ўстаноўлены больш за 100 іншых удзельнікаў і арганізатараў.

Аляксандр Цішчанка падкрэсліў, што ў несанкцыянаванай акцыі ўдзельнічалі актыўныя чаўнакі-бізнэсмены. Правяраючы свае базы, пагранічнікі выявілі недапушчальныя факты, якія датычацца гэтых людзей. Напрыклад, было ўстаноўлена, што адна сямейная пара 11 чэрвеня 15 разоў перасекла граніцу цераз пункт пропуску «Брузгі» на пяці розных аўтамабілях. «Зразумела, што гэтыя асобы незаконна ўвозяць або вывозяць тавары», — адзначыў прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта. Ён дадаў, што 60 працэнтаў такіх людзей — непрацуючыя. Ёсць звесткі, што ў кожнага з гэтых людзей ёсць па некалькі добрых аўтамабіляў, а таксама камфартабельныя катэджы — назваць іх беднымі немагчыма.

Як паведамілі БЕЛТА ў службе інфармацыі пракуратуры Гродзенскай вобласці, каб вызваліць дарогу для пропуску аўтамабіляў, супрацоўнікі органаў унутраных спраў адцяснілі грамадзян з праезнай часткі. У 21.00 рух аўтатранспарту быў адноўлены. «Пракурорам Гродзенскага раёна, які быў сведкам пікета, дзеянні супрацоўнікаў міліцыі па дэблакіраванні праезнай часткі дарогі паблізу пункта пропуску прызнаны законнымі і адэкватнымі абстаноўцы, што склалася», — адзначылі ў пракуратуры.

Адносна 14 актыўных удзельнікаў пікета, якія аказалі непаслушэнства супрацоўнікам міліцыі, складзены адміністрацыйныя пратаколы па артыкулах 23.34 (парушэнне парадку арганізацыі або правядзенне масавага мерапрыемства або пікетавання) і 23.4 (непадпарадкаванне законнаму распараджэнню або патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёю службовых паўнамоцтваў) КоАП Беларусі.

Па факце несанкцыянаванага пікетавання пракуратура Гродзенскага раёна праводзіць праверку на прадмет наяўнасці або адсутнасці ў дзеяннях зачыншчыкаў саставу крымінальнага злачынства.

Паводле слоў Аляксандра Цішчанкі, пасля прыняцця пастановы ўрада аб абмежаванні вывазу паліва і некаторых тавараў скарацыўся паток асоб, якія перасякаюць граніцу. У прыватнасці, на польскім і літоўскім напрамку зніжэнне склала 30-40 працэнтаў. Сітуацыя на граніцы ўзята пад кантроль. Дзяржпагранкамітэт працуе ў цесным супрацоўніцтве з КДБ, МУС і мытнымі органамі. Праваахоўнікі будуць не толькі спыняць спробы незаконнага правозу тавараў праз пункты пропуску, але і ўзмацняюць кантроль на зялёнай граніцы.

Прэс-сакратар Дзяржпагранкамітэта адзначыў, што цэны ў Беларусі сацыяльна арыентаваныя. Калі ў такіх умовах не абмяжоўваць вываз паліва і пэўных тавараў, то давядзецца ўзняць цэны, што негатыўна адаб'ецца на ўсім насельніцтве краіны, якое не павінна цярпець з-за невялікай колькасці чаўнакоў.

Адносна таксама нагадаў, што Беларусь мае перад суседнімі дзяржавамі пэўныя абавязацельствы, якія датычацца забеспячэння транзіту праз граніцу. Паводле яго слоў, з-за чаўнакоў на граніцы могуць утварацца чэргі, што будуць перашкаджаць людзям, якія выязджаюць на адпачынак або ў камандзіроўку. Ён таксама адзначыў, што чаўнакі наносяць урон не толькі эканоміцы Беларусі, але, у прыватнасці, эканомікам Польшчы і Літвы. Прымаючы абмежавальныя меры, Беларусь робіць гэта ва ўнісон з суседнімі дзяржавамі. Так, Літва разглядае магчымасць абмежавання вывазу паліва на аўтамабілях і плануе дазволіць выезд на машынах не часцей як пяць разоў за месяц, у той час як у Беларусі ўведзена абмежаванне не часцей за шэсць разоў у месяц.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 27 июля 2011 г. проводит открытый аукцион № 09-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 4 земельных участков для строительства в г. Минске:

№ п/п	Место расположения земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1.	ул. Барамзиной в жилом районе Сокол	500000000004004553	0,2000	Многофункциональный комплекс с объектами общественного питания, торговли и обслуживания населения	205 072 140	20 000 000	4 616 907	–
2.	В районе ул. Основателей (Озерище)	500000000009004679	0,1500	Объект автосервиса	44 237 970	4 000 000	4 572 196	–
3.	В районе ул. Янки Лучины и Игуменского тракта в общественном центре жилого района Лошица	500000000003004005	0,4511	Многофункциональный культурно-развлекательный комплекс (кинотеатр, видеозалы, библиотека) с помещениями общественного питания	556 903 410	55 000 000	5 310 012	–
4.	ул. Фучика – ул. Ангарская	500000000002007550	0,1500	Объект общественного питания на 50 посадочных мест с магазином и кулинарией	193 924 430	19 000 000	4 722 152	–

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **27 июля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Марк

Фермер Мікалай СІЛІН:

«Я З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ ПРАДАВАЎ БЫ ЛЮДЗЯМ ГРЭЧКУ ЗА 10 ТЫСЯЧ»

КАРЭСПАНДЭНТ «Звязды» завітала да піянера фермерскага руху ў Беларусі. Свой бізнэс Мікалай СІЛІН пачынаў яшчэ пры савецкай уладзе ўсяго з 39 гектараў пашы. Дзякуючы фермерству, дарэчы, пазнаёміўся з будучай жонкай. Пасля вяселля Святлана стала правай рукой мужа. А з цягам часу афармліла і сваю фермерскую гаспадарку. Сёння ў Сіліных на пару ні многа ні мала — 192 гектары зямлі.

«Раней трактар каштаваў столькі ж, колькі «Жыгулі»»

Да 89-га года Мікалай Сілін, інжынер па адукацыі, і думаць не думаў пра тое, каб пераехаць са сталіцы ў вёску. Ды і з чаго б: працаваў па спецыяльнасці, хуткімі тэмпамі прасоўваўся па кар'ернай лесвіцы.

— Звольніцца з працы і пакінуць Мінск вымушаны быў па сямейных абставінах, — расказвае Мікалай Васільевіч. — У той год сур'ёзна захварэў тата. Яго трэба было даглядаць, вазіць у Бараўляны на лячэнне. Менавіта таму я набыў дом у Валожынскім раёне, куды і перавёз бацьку з забруджанай Краснапольшчыны.

Праца ў калгасе не надта прывабліва, вось і вырашыў Мікалай Сілін адведаць уласнага «фермерскага хлеба».

— У той час фермер на вёсцы быў не меншай экзотыкай, чым іншамарка ці мабільны тэлефон, — з усмешкай узгадвае піянер фермерскага руху. — «Дзівак», — смяяліся адны. «Гаспадар», — захапляліся іншыя. Зямлю мне выдзелілі без асаблівых праблем, чаго не скажаш пра трактар. Куды не прыйду — ніхто нічога не ведае. Маўляў, «вы першы, хто звяртаецца з такой просьбай...».

Мікалаю Васільевічу нічога не заставалася, як напісаць ліст у Савет Міністраў БССР. І толькі пасля аўдыенцыі ў першага намесніка прэм'ер-міністра Хусаінава яму ў рэшце рэшт выдзелілі трактар.

— «Беларус» тады каштаваў столькі ж, колькі «Жыгулі», — заўважае суразмоўца. — Сёння ж — у 4 разы даражэй.

Што цікава, менавіта фермерства звяло прадпрымальнага маладога чалавека з будучай жонкай. Святлана ў той час працавала ў калгасе бухгалтарам.

— Коля прыходзіў у кантору тэхніку выпісваць, — расказвае Святлана. — Так і пазнаёміліся. Ён на той час на вясковых мерках ужо нядрэнна зарабляў. Мог дазволіць сабе паесці нават у рэстаране. Аднойчы прыходзіць і кажа: «Я замовіў столік, увечары ідзём з табой вячэраць». 10 рублёў работнікам таго рэстарана ў залог пакінуў, а я не пайшла *(смяецца)*. Саромелася. Нязвыклая была, вясковая, да такіх месцаў. Запрасіла яго на дранікі. Муж і зараз смехам кажа, што ў той вечар я і пакарыла яго сваімі дранікамі.

Столькі агуркоў прапала! Дзе гэта бачна, каб так абясцэньвалі працу фермера? Лепш будуць набываць за мяжой у тры разы даражэй, страчваць валюту (якой сёння няма!). А можна ж вырошчваць самім — тым самым рабіць тыя самыя закруткі з карнішонамі ды джэмы з парэчак больш даступнымі для беларусаў.

Побач з домам Сіліных знаходзіцца ферма. Быў час, калі яна была запоўнена свінямі. Але пасля таго, як усё пагалоўе скасіла сіняе вуха (хвароба. — **Аўт.**), пераключыліся на гародніну. На 192 гектарах зямлі (з іх 152 належыць Мікалаю Васільевічу, 40 — Святлане) вырошчваюць ячмень, бульбу, цыбулю, моркву, капусту ды грэчку. Дарэчы, вырошчваць апошнюю, такую запатрабаваную сёлета культуру, фермерам, як высветлілася, не надта выгадна.

— Мяркуйце самі, летась я здаў па дзяржзаказе каля 50 тон грэчкі на гомельскі завод. Прынялі яе ў мяне па 1200 рублёў за кілаграм. Перапрацавалі і прадаюць па заваблачных цэнах. Я дапускаю, што павялічыліся выдаткі на перапрацоўку, але не настолькі ж!.. Вось і атрымліваецца, што беларусы, аддаючы за крупы шалёныя грошы, кормяць армаду гандляроў. І чамусьці ніхто гэта не кантралюе.

Пакуль што фермер на пастаўку грэчкі ніякіх дагавораў не заключаў. Навучаны горкім вопытам, разумее, што больш выгадна заплаціць за перапрацоўку і забраць гатовыя крупы. А пасля прадаць іх самому на рынку па прымальным і для сябе, і для пакупнікоў кошце.

— Грэчка сёння ў крамах каштуе 16-18 тысяч рублёў, — канстатуе факт Мікалай Васільевіч. — Я з задавальненнем прадаваў бы яе па 10 тысяч. І людзі б, перакананы, з не меншай ахвотай набывалі.

— Цікава, а ці лёгка ўжыцца двум фермерам у адным доме? — звяртаюся да сямейнай пары.

— Калі яны муж і жонка, то так *(смяецца)*. У нас узаемапаразуменне. Света мне бухгалтэрыю дапамагае весці, а я ёй апрацоўваю зямлю.

Зразумела, што аднаму Мікалаю Васільевічу з такімі плошчамі не справіцца — наймае механізатара. Карыстаюцца фермеры дапамогай наёмных работнікаў і падчас сезонных работ.

— Жанчыны, яшчэ не паспелі ўбраць ураджай, ужо просяцца, каб я іх запісала налета, — расказвае Святлана. — Зімой па некалькі разоў тэлефануюць, баяцца, каб мы пра іх не забыліся. Таму з чымчым, а з працоўнымі рукамі праблем у нас няма. Галоўнае, каб было чым плаціць.

— І колькі, калі не сакрэт, плаціце сваім работнікам?

— Пра зарплату ж ніхто не кажа, — усміхаецца Мікалай Васільевіч. — Але калі просяцца, значыць, яна іх задавальняе.

«Парэчкі ды карнішоны так і засталіся летась на полі»

Мікалай Сілін пасля таго, як збярэ ўраджай, плануе развярнуць будоўлю. У прыватнасці, марыць перабудаваць ферму, у якой дагэтуль стаялі свінні, у сховішча для гародніны. Гаспадар перакананы, што калі б у фермераў былі свае сховішчы, то гародніна каштавала б значна танней. Акрамя таго, як толькі з'явіцца магчымасць, Сіліны думаюць абзавесціся маразільнымі камерамі.

— Трэба марозіць парэчкі, каб зімой даражэй прадаваць, — кажа Святлана. — А як па-іншаму? 5-6 тон збіралі з гектара (усяго ягадай засаджана 4 гектары). І аддавалі за капейкі.

— А летась, калі пачулі, што ягаду прымаюць па 1500-1600 рублёў за кілаграм, плюнулі і наогул не збіралі. Які сэнс, калі мне практычна столькі ж трэба заплаціць чалавеку, які будзе яе збіраць на сонцапёку. Плюс выдаткі на дастаўку... Навошта мне працаваць сабе ва ўрон?

Сумна скончылася і спроба фермераў заняцца карнішонамі. Маладзенскае перапрацоўчае прадпрыемства спачатку паабяцала прыняць агуркі па тры тысячы за кілаграм. А калі завезлі першую партыю, закруцілі носам: маўляў, калі б яны былі з хвосцікамі, то прынялі б па тры тысячы, а так — толькі па 800 рублёў.

— У выніку мы ўсе паўгектара агурочніку зааралі дыскамі. Столькі агуркоў прапала! Дзе гэта бачна, каб так абясцэньвалі працу фермера? Лепш будуць набываць за мяжой у тры разы даражэй, страчваць валюту (якой сёння няма!). А можна ж вырошчваць самім — тым самым рабіць тыя самыя закруткі з карнішонамі ды джэмы з парэчак больш даступнымі для беларусаў.

— Адным словам, вырошчваць вы навучыліся, а вось з рэалізацыяй праблемы...

— Так. Мы летась раёну здалі капусту. Дык дагэтуль — ужо і новую пасадзілі — грошы не бачылі за яе. Як думаеце, калі папросяць зноў, ці дам? Не, вядома. Былі выпадкі, што прапаноўвалі дзяржаўныя прадпрыемствы замест грошай за моркву ўзяць тушонку. Навошта мне іх тушонка? Я ж за яе трактар ці насенне не куплю. Сапраўды, вырошчваць стала лягчэй, а вось рэалізоўваць...

«За 22 гады я так ні разу не быў у водпуску»

Расшырацца Сіліны пакуль не збіраюцца.

— Можна было б узяць яшчэ колькі гектараў зямлі, павялічыць колькасць працоўных месцаў... Я думаў над гэтым пытаннем і год, і два таму. Але зараз такія думкі адляцелі ўбок. Каб расшырацца, трэба як мінімум, мець празрыстыя рынкі збыту і даступную тэхніку. А мы сёння нават крэдыт не можам атрымаць, бо ў банку няма грошай.

Думаюць фермеры, як бы восенню не апынуцца ў мінусе. І думкі гэты маюць пад сабой падставы: закупачны кошт, напрыклад, на фуражны ячмень павысіўся ўсяго на 10%, а паліва падаражэла ў параўнанні з мінулым годам на 50%, тэхніка ды запчасткі да яе — у тры разы.

— Я яшчэ паспеў узяць у крэдыт угнаенні, паліва, тэхніку, — кажа першы фермер у Беларусі. — А вось як буду іх выплачваць, не ведаю... Калі СВК грошы выдзяляюць з бюджэту, то мне, фермеру, даводзіцца разлічваць толькі на сябе. Ёсць верагоднасць, што зноў, як ва неўраджайныя гады, давядзецца ехаць зімой на заробкі ў Расію. Сям'ю ж карміць трэба.

— Столькі праблем... Ніколі не было жадання ўсё кінуць і заняцца чым-небудзь іншым?

— У нашай фермерскай гаспадарцы не ўсё так дрэнна, як можа падацца з маіх слоў. Я наўмысна акцэнтую ўвагу на праблемных кропках, каб на іх звярнулі ўвагу, прынялі меры. Ураджай мы летась сабралі добры. У гэтым годзе павялічылі пасяўныя плошчы, таму збяром яшчэ большы. Было б куды рэалізаваць... А што тычыцца асабіста мяне, то за 22 гады я так прызвычаіўся да свайго ладу жыцця, што не ўяўляю сябе без зямлі. Ну, як я не засею яе вясной? Што тады буду збіраць восенню *(усміхаецца)*? Як бы ні складана было, але гэта частка мяне.

— А як адпачываюць фермеры?

— У нас не бывае выхадных. Я за 22 гады забыўся, што такое водпуск. Праца ёсць заўсёды: трэба пасеяць, пасля падкарміць, прапалоць, сена нарыхтаваць... У мяне ёсць конь Каштан. Трымаю яго для душы. Я ў мінулым і рыбак, і паляўнічы. Ужо 10 гадоў не быў ні на рыбалцы, ні на паляванні. Былі спробы, але... *(смяецца)*. Пайшоў не так даўно на возера рыбу лавіць, а думкі не пра рыбу, а пра тое, што трэба ўгнаенні ўнесці.

— Мікалай Васільевіч, можа, у вас ёсць нейкі маленькі сакрэт, якім бы вы хацелі падзяліцца з фермерам, які толькі пачынае?

— Самае галоўнае на рынку — не падманваць. Тады цябе будуць паважаць, а твая прадукцыя будзе карыстацца попытам. Не так даўно побач з намі ўзяў зямлю фермер, які толькі пачынае гэтую справу. У мяне ад яго сакрэтаў няма: усё расказваю, падказваю, тэхнікай, калі ёсць магчымасць, дапамагаю. Няхай вучыцца, няхай працуе. Чым больш у Беларусі будзе фермераў, тым лепш: магчыма, да нас пачнуць прыслухоўвацца. А пакуль што, на жаль, ніхто ў нас не зацікаўлены. Не модныя мы зараз.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

Валожынскі раён.

P.S. ***Мікалай Сілін з'яўляецца сёння старшынёй Савета Мінскай абласной асацыяцыі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Пра магчымыя шляхі вырашэння праблем беларускіх фермераў «паразмаўляем» з ім у адным з бліжэйшых нумароў.***

У калег — юбілей

Анатоль ЛЕМЯШОНАК:

«НЕ БЕГЧЫ ЗА ФАКТАМ, А ПРАГНАЗАВАЦЬ СІТУАЦЫЮ»

20 гадоў таму, 14 чэрвеня, свет пабачыў першы нумар газеты «Рэспубліка». Сёння газета прапануе сваім чытачам шэраг спецыяльных выпускаў рознай тэматыкі, аднак самымі вядомымі і паспяховымі сталі «Эканамічная серада» і «Рэспубліка дзелавая», дзе асвятляюцца актуальныя пытанні эканамічнага жыцця Беларусі, публікуецца штотыднёвы агляд заканадаўча-прававых актаў, пастаноў і каментарыі да іх спецыялістаў.

Фота Валерыя ХАРЧАНКІ.

Паводле слоў галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка», старшыні ГА «Беларускі саюз журналістаў» Анатоля Лемяшонка, эканамічна-фінансавая сітуацыя ў краіне будзе хваляваць у бліжэйшы час усе друкаваныя перыядычныя выданні. І не толькі ў сэнсе тэматыкі. Падаражанне паперы кладзецца вялікім цяжарам на перыёдыку. Аднак калі апошняя выконвае дзяржаўны заказ, значыць, мае права на адпаведную фінансавую падтрымку, якая зараз з'яўляецца абсалютна недастатковай. Што да камерцыйных выданняў, то яшчэ нядаўна досыць паспяховыя з іх пачалі разважаць над «пераходам» у інтэрнэт. Тым часам дзяржаўным газетам-часопісам давядзецца моцна змагацца за падпісчыкаў, якія, зразумела, хацелі б бачыць на старонках любімых выданняў каментарыі чыноўнікаў адносна той сітуацыі, якая склалася ў краіне. Анатоль Лемяшонак упэўнены, што людзі на насадах усё яшчэ баяцца сказаць «лішняе» слова і таму пытанне «Як выцягнуць чыноўніка на кантакт са СМІ?» застаецца для журналістаў адкрытым.

— Газеты былі і будуць, нягледзячы нават на імклівае распаўсюджванне інтэрнэту, — кажа Анатоль Лемяшонак. — Магчыма, газетам проста давядзецца крыху памяняць свой «профіль»... Мы не можам быць аператыўней за інтэрнэт, а значыць, будзем вымушаны не столькі бегчы за фактам, колькі аналізаваць яго. Неабходна больш займацца прагназаваннем, версіямі, забягаць наперад... Дарэчы, асцярожныя спробы прадбачыць сённяшняе становішча, безумоўна, мелі месца ў дзяржаўных СМІ, але, напэўна, яны павінны былі быць больш гучнымі...

Калі гаварыць аб перспектывах развіцця друкаваных СМІ, то іх інтэрнэт-версіі павінны пачынаць перакладацца на замежныя мовы — выходзіць на еўрапейскі рынак. Неабходна гаварыць і аб тым, каб нашы газеты выходзілі на рынак СМІ Мытнага саюза, дзе яны, лічу, могуць быць цікавымі не толькі для прадстаўнікоў беларускай дыяспары...

Святлана БАРЫСЕНКА.

З КАВЯРНІ ЭВАКУІРАВАЛІ КАЛЯ 100 ЧАЛАВЕК

Арыштаваны наведнік віцебскай кавярні «Тэатральнай», які паведаміў прадстаўніку адміністрацыі, што закладзеныя ім 2,2 кг тратылу неўзабаве выбухнуць.

Як паведаміў «Звяздзе» пракурор Кастрычніцкага раёна горада Віцебска Уладзімір Шалухін, гэта было а трэцяй гадзіне ночы. Супрацоўнікі кавярні адразу прынялі ўсе неабходныя меры па эвакуацыі наведвальнікаў і персаналу. Сапёры пасля карпатлівых пошукаў выбуховых рэчываў нічога не знайшлі. Кліент, які паведаміў пра тратыл, арыштаваны. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа. Высветлілася, што ён знаходзіўся ў нецвярозым стане. Мужчына за свае дзеянні можа быць пазбаўлены волі тэрмінам да пяці гадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ІП — РАБАЎНІК

На двух кіроўцаў з Украіны, якія спыніліся на ноч у в. Дварэц Лунінецкага раёна, напаў невядомы і пад пагрозай пашкоджання маёмасці забраў у аднаго 2 600 000 рублёў, а ў другога — 1 651 500.

Аператыўная група затрымала індывідуальнага прадпрымальніка з Лунінца, які ўжо быў судзімы за рабаўніцтва і незаконны абарот зброі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З НАЖОМ НА АЎТАМАБІЛІ

9 чэрвеня зранку нарад ДАІ спыніў «Фіят Дуката», вадзіцель якога прад'явіў дакументы на аўтамабіль і грамадзянскі пашпарт іншага чалавека. Ён патлумачыў, што стрыечны брат, маўляў, даў пакатацца. Праўда, чамусьці ў замку запальвання замест ключа быў нож!

Але на шкле, дарэчы, знайшлася аб'ява аб продажы аўтамабіля, гаспадар якога, як высветлілася, не толькі не меў стрыечнага брата, але і думаў, што яго «Фіят» спакойна начуе на паркоўцы каля гіпермаркета. Такім чынам, магіляўчанін даведаўся ад ДАІ не толькі пра згон свайго «Фіята», але ўжо і пра затрыманне злодзея (дарэчы, яшчэ і нецвярозага) з аўтамабілем.

У мужчыны, які ўжо раней быў асуджаны за згон транспарту, знайшлі таксама рэчы з іншых аўтамабіляў, узламаных у гэтую ж ноч. Паводле інфармацыі Магілёўскай ДАІ, сёлета ў Магілёве ўжо выкрылі 6 згоншчыкаў.

Ілона ІВАНОВА.

Футбол

БЕЛАРУСЬ АБЫГРАЛА ІСЛАНДЫЮ

У суботу ў Даніі стартавала фінальная частка моладзевага чэмпіянату Еўропы, на якім беларуская каманда выступае ў трэці раз. Падапечныя Георгія Кандрацьева, які напярэдадні турніру заяўляў, што нам па сілах выйсці ў паўфінал, пачалі з перамогі над зборнай Ісландыі — 2:0. Многія гэты матч лічылі барацьбой за другую пуцёўку ў паўфінал, першую аддаючы датчанам. Аднак датчане свой першы матч прайгралі швейцарцам (0:1). Цяпер, каб выйсці з групы, гаспадарам неабходна выйграваць сёння ўвечары — у нас. Паядынак пачнецца ў 21.45, яго пакажа беларускае тэлебачанне.

Перамога над ісландцамі ў матчы-адкрыцці чэмпіянату далася нам няпроста. Першы тайм атрымаўся вельмі стрыманым у выкананні абедзвюх камандаў — вельмі высокай была цана памылкі. Затое ў другім тайме, калі да канца асноўнага часу заставалася 13 хвілін, беларусы вырашылі выхад паядынку: спачатку Стас Драгун зарабіў пенальці, які рэалізаваў Андрэй Варанкоў, а пасля гол забіў Максім Скавыш. Вось як пракаментаваў матч **Георгій КАНДРАЦЬЕЎ**:

— Як я і думаў, матч аказаўся вельмі цяжкім. Падчас першага тайма было бачна, што хлопцы хвалявaліся. У нас не атрымлівалася гульня ў пас. Калі ў абароне мы дзейнічалі дастаткова ўпэўнена, то ў сярэдняй лініі і ў атацы практычна нічога не атрымлівалася. У перапынку я папрасіў хлопцаў разняволіцца і вельмі рады, што ў другім тайме нам шмат што ўдавалася і што мы дасягнулі такой патрэбнай перамогі, — цытуе галоўнага трэнера афіцыйны сайт УЕФА.

Герой матча Стас ДРАГУН, які зарабіў пенальці і чырвоную картку для гульца каманды Ісландыі, не стаў перабольшваць сваю ролю:

— У нас герояў — уся каманда. Адпрацавалі ўсе, пачынаючы ад масажыстаў і заканчваючы гульцамі. Усе рабілі адну справу. Добра, што так скончылася. Напярэдсе яшчэ дзве вельмі важныя гульні. Нас чакаюць добрыя супернікі. Трэба выйграваць, каб выходзіць з групы.

Капітан каманды Міхаіл СІВАКОЎ прызнаўся, што перад матчам не мог спаць:

— Звычайна перад гульнёй імкнуся гадзінку паспаць, але сёння злавіў сябе на тым, што не змог нават задрамаць. У галаве круціліся думкі, наколькі важны першы матч і што нам трэба дасягнуць станоўчага выніку. Было вельмі прыемна бачыць беларускія сцягі: дзякуй балельшчыкам, якія дабраліся да Даніі. Мяркую, іх было каля 20 чалавек.

Міхаіл Сівакоў, дарэчы, прызнаны лепшым гульцом матча, ён атрымаў кубак «The men of the mutch». Становішча ў групе В: Беларусь — 3 ачкі, Швейцарыя — 3, Данія — 0, Ісландыя — 0. Матч са Швейцарыяй мы правядзём 18 чэрвеня (пачатак у 21.45), паўфіналы пройдуць 22 чэрвеня (19.00 і 22.00), фінал — 25 чэрвеня (21.45).

На турніры, дарэчы, разыгрываюцца і пуцёўкі на Алімпіяду ў Лондан. Гаспадары англічане атрымліваюць іх аўтаматычна, і калі яны выйдуць з групы, то ўсе паўфіналісты атрымаюць пропуск на Гульні-2012. Калі ж у плэй-оф пачынальнікі футбола не пройдуць, то пуцёўкі атрымаюць фіналісты чэмпіянату Еўропы, а паўфіналісты правядуць за яе дадатковы матч.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Тур 13: тры паядынкі скончыліся разгромам

У выхадныя адбыліся матчы 13-га тура чэмпіянату краіны па футболе. БАТЭ, аслаблены моладзевым чэмпіянатам Еўропы, куды з барысаўскага клуба адправілася 6 гульцоў, нягледзячы ні на што, атрымаў перамогу над «Нафтанам» на выездзе — 2:0. Галамі вызначыліся Шытаў і Радзькоў.

А вось сталічнае «Дынама» справіцца з кадравымі праблемамі не здолела і на хатнім стадыёне саступіла «Мінску» — 1:2. На галы Разіна і Сашчэкі дакладным ударам адказаў Вячаслаў Глеб. «Віцебск» у гасцях у «Тарпеда» разграміў жодзінскі клуб — 3:0, «Белшына» на выездзе разграміла брэсцкае «Дынама» — 4:1. Ну а тое, што зрабіў «Шахцёр» з «Нёманам», нават не разгром, а нешта большае — 5:0. І толькі «Днепр» і «Гомель» разышліся нулявой нічыёй.

Турнірнае становішча: БАТЭ — 31 ачко, «Шахцёр» — 24, «Нафтан» — 21, «Тарпеда» — 18, «Віцебск» — 17, «Мінск» — 16, «Гомель» — 16, «Дынама» (Мінск) — 15, «Белшына» — 15, «Нёман» —14, «Днепр» — 12, «Дынама» (Брэст) — 11.

Алена КРАВЕЦ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

Наименование объекта	**Изолированное помещение (помещение отделения почтовой связи)**
Местонахождение объекта	Брестская обл., г. Кобрин, ул. Новая, 44
Продавец объекта	Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» тел. 80162 20 52 37, 20 57 21, 22 06 13
Начальная цена продажи, руб.	6 214 305
Сумма задатка, руб.	621 000
Сведения об объекте	Изолированное помещение в 1-этажн. здании 1977 г.п. площадью 194,2 кв.м; общая площадь изолированного помещения – 63,0 кв.м
Организатор торгов	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 80162 20 87 85, 23 12 63, 23 44 78, www. brest–region.by***

Аукцион состоится **15 июля 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются*:*

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – **по 14 июля 2011 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов.

5. Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.

6. Представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Порядок проведения аукционных торгов определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 14 июля 2011 г. включительно.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 15 июля 2011 г. проводит открытый аукцион № 08-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право аренды на 5 лет 3 земельных участков для строительства в г. Минске:

№ п/п	Место расположения земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1.	ул. Колесникова, в коммунальной зоне по проезду Масюковщина	500000000006006124	0,1500	Станция технического обслуживания с помещениями сопутствующего назначения	67 900 140	6 000 000	4 742 010	–
2.	ул. Колесникова, в коммунальной зоне по проезду Масюковщина	500000000006006125	0,1000	Мойка автомобилей	45 266 760	4 000 000	4 652 786	-
3.	Район ул. Янки Лучины и Игуменского тракта в общественном центре жилого района Лошица	500000000003004004	0,2018	Банно-оздоровительный комплекс с помещениями общественного питания	249 131 190	24 000 000	4 982 560	–

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **15 июля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (не позднее 8 июля 2011 г.) в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 13 июня 2011 г. по 8 июля 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

ЗВЯЗДА 14 чэрвеня 2011 г.

«МЫ ЗАЎСЁДЫ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак блокі ўжо адпрацавалі сваё. І кацёл, і паравая турбіна, і дапаможнае абсталяванне выпрацавалі рэсурс. Натуральна, паўстала пытанне: мяняць гэтыя вузлы на аналагічныя ці мадэрнізаваць іх? Мы вырашылі прывесці блокі ў адпаведнасць з патрабаваннямі сучаснасці. Замена праточнай часткі якраз і дала прыбаўку ў 15 МВт з блока і павялічыла іх эканамічнасць. Напрыклад, у недалёкім мінулым расход паліва на станцыі складаў 318 г на кВт/гадзіну. З цягам мадэрнізацыі ён змяншаўся і па выніках мінулага года дасягнуў 312,2 г на кВт/гадзіну. Гэта даволі добры вынік.

Акрамя самой турбіны, мы займаемся кацельным абсталяваннем. Там укараняецца вельмі цікавае рашэнне, якое дазволіць павысіць яго эканамічнасць і надзейнасць, — павелічэнне паверхні нагрэву вадзянога эканамайзера. Гэта дае павелічэнне каэфіцыента карыснага дзеяння на 0,6-0,8 працэнта за кошт зніжэння тэмпературы сыходзячых газаў, што вельмі істотна для блока ў 300 МВт. З гонарам хачу адзначыць, што гэта рашэнне прапанавана спецыялістамі нашай ДРЭС і падтрымана галіновым інстытутам і тэхсаветам аб'яднання «Віцебскэнерга». Падобную мадэрнізацыю мы правялі ўжо на двух энергаблоках.

Акрамя таго, на станцыі працуюць дзве генератарныя ўстаноўкі магутнасцю 5 і 2,5 МВт. Гэта новыя тэхналогіі, якія ў Беларусі ўпершыню выкарыстаны менавіта на нашай станцыі. Упершыню такія ўстаноўкі мы ўбачылі ў калег ва Украіне. Такія машыны працуюць на некаторых газавых радовішчах у Расіі, на ТЭЦ-23 у Маскве...

Калі гаварыць простай мовай, газавікі нам падаюць газ з ціскам 40 атмасфер. Газаразмеркавальная станцыя зніжае ціск да 12. А нам для спальвання газу ў катлах дастаткова 1,2 атмасферы. Раней гэта зніжэнне дасягалася з дапамогай заслонкі. Цяпер замест яе паставілі газавую турбіну і пачалі атрымліваць практычна бясплатную электраэнергію. Для большага разумення адзначу, што электрычнасцю, якую выпрацоўваюць дзве нашы ўстаноўкі, можа забяспечыць патрэбу ў электраэнергіі горада Новалукомль і нават Чашніцкага раёна. Такім чынам, агульная магутнасць Лукомльскай ДРЭС сёння складае 2459,5 МВт. Асноўным палівам для станцыі з'яўляецца газ. У якасці рэзерву можа выкарыстоўвацца мазут.

— Але ж і прагрэс не стаіць на месцы...

— У нашай бліжэйшай перспектыве — будаўніцтва сучаснай парагазавай установкі на 400 МВт. Гэта магутнасць будзе падавацца на нашу падстанцыю, якая, як і сама электрастанцыя, з'яўляецца буйнейшай у краіне.

Увод блока ў эксплуатацыю прызначаны на 2013 год. Крэдытныя рэсурсы прадастаўляе Кітайская Народная Рэспубліка. Генеральны падрад на будаўніцтва таксама належыць кампаніі з Паднябеснай — Кітайскай Нацыянальнай карпарацыі па імпарце і экспарце машын і абсталявання. Ужо вызначана пляцоўка, праектна-пошукавыя работы пачаліся 14 лютага. 8 сакавіка прыйшлі два кантэйнеры з абсталяваннем. Сёлета ў чэрвені-ліпені мы павінны прыступіць да планіроўкі і ўзвядзення нулявога цыкла. Пакуль знаёмім кітайскіх партнёраў з нашымі людзьмі, тэхнічнымі магчымасцямі, будматэрыяламі — па кантракце падрадчыкі павінны задзейнічаць 30 працэнтаў беларускіх матэрыяльных рэсурсаў. Айчынныя арганізацыі, у тым ліку і аб'яднанне «Віцебскэнерга», гатовыя іх прадаставіць.

У котлатурбінным цэху.

Абсталяванне для ПГУ — і паравая турбіна, і кацёл-утылізатар — вытворчасці КНР. Газавая ж турбіна распрацавана кампаніяй Siemens. На сёння гэта самая перадавая і надзейная тэхналогія. Дарэчы, машына нямецкай кампаніі была адной з нашых асноўных умоў. Акрамя таго, перш чым заключаць кантракт, мы азнаёміліся з вытворчасцю абсталявання ў КНР і засталіся задаволенымі.

Персанал для будучай установкі падрыхтуюць з ліку работнікаў Лукомльскай ДРЭС. Спецыялісты, якія маюць вопыт работы на нашых энергаблоках, будуць накіраваны ў Кітай на павышэнне кваліфікацыі. Размова ідзе прыкладна пра 30 чалавек. У той жа час будзем рыхтаваць спецыялістаў, якія заменяць гэтых шматвопытных работнікаў.

— Які лёс чакае немадэрнізаваныя блокі станцыі?

Пытанне канчаткова не вырашана. У сувязі з прыняццем праграмы будаўніцтва атамнай станцыі, актыўным развіццём парагазавай тэхналогіі запатрабаванасць у рабоце чатырох пакуль не мадэрнізаваных блокаў Лукомльскай ДРЭС можа істотна знізіцца. Усё залежыць ад тэрмінаў уводу новых энергетычных аб'ектаў. Нашы спецыялісты, у тым ліку і я, бачаць, што наша станцыя, усе восем блокаў, будуць запатрабаваны да 2018 года. Калі будзе ўведзена ў эксплуатацыю парагазавая ўстаноўка на 400 МВт, — тым больш, калі запусцяць АЭС, — нашы блокі паступова будуць выводзіцца з работы, паколькі стануць неканкурэнтаздольнымі па кошце атрыманай электраэнергіі. Для параўнання: ПГУ-400 мае расход паліва прыкладна 240 г на кВт/гадзіну супраць нашых 312 г. Таму з уводам Мінскай ТЭЦ-5, нашай ПГУ-400 паступова плануем вывесці з работы сёмы і восьмы блокі, а з уводам АЭС — пяты і шосты блокі.

Магчымы і іншы сцэнарый развіцця падзей. Як адзначыў міністр энергетыкі Аляксандр Уладзіміравіч Азярэц, калі ўвод ПГУ-400 пройдзе паспяхова, магчыма, замест вышэйназваных чатырох блокаў-«ветэранаў» хуткімі тэмпамі будзе ўзведзена яшчэ адна ПГУ-400. У любым выпадку нам бачыцца, што на Лукомльскай ДРЭС застанецца чатыры дзейныя мадэрнізаваныя блокі з пралангіраваным рэсурсам для зняцця пікавых нагрузак у рэспубліцы.

— ДРЭС, падобныя на Лукомльскую, ідуць тым жа шляхам?

— Станцыі-блізняты ёсць і ў Расіі, і ў Прыбалтыцы. Літоўская ДРЭС, напрыклад, таксама пайшла па шляху мадэрнізацыі толькі кацельнага абсталявання дзейных блокаў і будаўніцтва ПГУ. Зараз яны завяршаюць будаўніцтва парагазавай установкі на 400 МВт. На самой станцыі працуюць два энергаблокі. Аднак астатняе абсталяванне падтрымліваецца ў працаздольным стане.

У Расіі мы падтрымліваем сувязь з Канакоўскай і Кастрамской ДРЭС. Канакоўцы следам за намі пайшлі па шляху мадэрнізацыі паравой часткі турбіны. Чатыры блокі ўжо ўведзены ў эксплуатацыю, на двух вядуцца работы. Акрамя гэтага, яны, як і мы, разглядаюць пытанне будаўніцтва ПГУ на 400 МВт. Кастрамская ДРЭС будаўніцтва ПГУ не разглядае, аднак яна раней за іншых правяла мадэрнізацыю турбіннага абсталявання. Праўда, па менш дасканалай тэхналогіі.

Увогуле, Кастрамская ДРЭС — гэта нашы калегі, з якімі ўвесь час мы ў пэўным сэнсе спаборнічаем. Мы, як правіла, ці балансуем, ці крыху адстаём ад іх у плане расходу паліва. І справа не ў тым, што мы горш працуем ці горш падрыхтавалі абсталяванне, а ў прыродным фактары: яны карыстаюцца праточнай, больш халоднай вадой. А мы з-за высокай тэмпературы вады ў возеры Лукомльцы, хачу сказаць без перабольшвання, заўсёды былі першапраходцамі. На станцыі ёсць цэлы стэнд з партрэтамі нашых рацыяналізатараў.

Сёння ўжо, вядома, цяжка знайсці нейкае рэвалюцыйнае рашэнне. За 40 гадоў мы нашу станцыю настолькі перабралі, пералапацілі... Аднак спецыялісты ДРЭС кожны раз знаходзяць новыя рацыянальныя прапановы па павышэнні эканамічнасці работы станцыі.

Некалі была распаўсюджана практыка завочнага навучання нашых спецыялістаў у ВНУ. Я лічу, што гэта нармальна, бо спецыяліст з атрыманымі ведамі дакладна застанецца працаваць на прадпрыемстве. Аднак мы адчулі пэўны дэфіцыт у новых ідэях, якія звычайна прапануюць маладыя спецыялісты дзённай формы навучання. Таму мы з гэтага года імкнёмся максімальна набіраць менавіта такіх спецыялістаў. Новыя людзі прыносяць новыя ідэі.

— Летась Лукомльская ДРЭС павялічыла выпрацоўку электрычнай энергіі амаль на 30 працэнтаў...

— Сапраўды так. Выраблена амаль 14 млрд кВт/гадз. электрычнай энергіі. За мінулы год на станцыі зэканомлена больш за 17,5 тыс. тон умоўнага паліва. Рост выпрацоўкі энергіі звязаны з павелічэннем электраспажывання ў рэспубліцы.

Мы добра разумеем, што з пункту гледжання эканамічнай мэтазгоднасці ў сённяшніх умовах больш выгадна электраэнергію закупляць з-за мяжы. Калі ёсць прапанова і адпаведныя дамоўленасці. Астатнюю энергію мы вырабляем на той колькасці энергаблокаў, якая для гэтага дастатковая. Аднак мы павінны быць гатовымі ў выпадку неабходнасці запусціць усе восем блокаў.

А ўвогуле пры такой цане на газ мы вымушаны ісці адзіна магчымым шляхам — зніжэння выдаткаў. Таму і парагазавыя ўстаноўкі будуюцца, і АЭС. Больш за тое, электраэнергія, атрыманая па гэтых тэхналогіях, будзе канкурэнтаздольнай не толькі ў краіне, але і за яе межамі. А гэта стабільны экспарт.

У завяршэнне хачу адзначыць, што 40-гадовы вопыт работы станцыі падмацоўвае ўпэўненасць у тым, што мы справімся і з новымі выклікамі. Стабільная работа ДРЭС – гэта найвышэйшая адказнасць і прафесіяналізм персаналу, гэта этапы мадэрнізацыі, бездакорныя дзеянні соцень прафесіяналаў у самых складаных сітуацыях. Усе гэтыя лепшыя традыцыі закладзены нашымі ветэранамі: будаўнікамі, эксплуатацыйнікамі, першаадкрывальнікамі ДРЭС, нашымі настаўнікамі. Мы іх памятаем і кожны раз удзячныя лёсу за тое, што ён даў нам магчымасць разам працаваць і вучыцца ў дырэктараў ДРЭС Сухоцкага А.І., Жураўлёва Л.А., галоўных інжынераў Герасімава В.В., Ніканорава Л.Ф., Паўлышава А.К., начальніка КТЦ Кускова І. А., начальніка ЭЦ Сарокі Л.Г., начальніка ЦЦР Піскунова В.М., галоўнага інжынера РУП «Віцебскэнерга» Якаўлева Г.В. і многіх іншых. Шчыры дзякуй ім.

— Ад імя калег, чытачоў «Звязды» шчыра віншуем вас, увесь калектыў Лукомльскай ДРЭС з юбілеем айчыннай энергасістэмы. Зычым і далейшых працоўных дасягненняў, паспяховага правядзення мадэрнізацыі станцыі і, вядома, безаварыйнай працы!

Машыністы-абходчыкі Аляксей ВЫСОЦКІ, Алег ГАНЧАРОЎ, Андрэй ЕРМАЧЭНКА, Андрэй БАЧАНКОЎ.

• Старшы дзяжурны электраманцёр Іван ГАРБАЧОЎ і кампрэсаршчык Мікалай КАЧАН на ўчастку адкрытага размеркавальнага прыстасавання.

• Начальнік цэха цэнтралізаванага рамонту Юрый КАВАЛЕНКА ўзначальвае калектыў самы шматлікі сярод іншых падраздзяленняў прадпрыемства.

Намеснік дырэктара па сацыяльных пытаннях і ідэалагічнай рабоце Валерый ПЯНКРАТ:

«АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — РАБОЦЕ З КАДРАМІ»

Намеснік дырэктара Лукомльскай ДРЭС Валерый ПЯНКРАТ.

— САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА Лукомльскай ДРЭС сёння складаецца з такіх значных для прадпрыемства і горада Новалукомля аб'ектаў, як Палац культуры энергетыкаў, спарткомплекс, гасцініца, лазня, дзіцячыя яслі-садок, пяць інтэрнатаў, аздараўленчы дзіцячы лагер, аздараўленчы комплекс, падсобная гаспадарка... Значных для горада таму, што імі карыстаюцца не толькі і нават не столькі нашы работнікі.

Сваім работнікам, якіх, да слова сказаць, зараз на станцыі працуе амаль дзве тысячы чалавек, прадпрыемства заўсёды гатова падставіць плячо. Калектыўны дагавор прадугледжвае даволі важкі сацыяльны пакет. Так, у нас вядзецца свая чарга для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Паўтара года таму быў здадзены 40-кватэрны дом.

— На такой складанай, высокатэхналагічнай вытворчасці, безумоўна, многае залежыць ад кадраў...

— За многія гады нам удалася сабраць і падрыхтаваць на станцыі высокапрафесійны калектыў. Аднак нельга сцвярджаць, што ніякіх цяжкасцяў з кадрамі мы не маем. Асабліва гэта датычыцца такой прафесіі, як праграміст. Усё ж многія працэсы на ДРЭС аўтаматызаваныя і камп'ютарызаваныя. Сучаснае абсталяванне патрабуе і адпаведных ведаў. Узнікаюць пытанні і па дзяжурным персанале. Моладзь не надта ірвецца працаваць пазменна, асабліва калі змена начная.

Як і раней мы актыўна займаемся падрыхтоўкай і падрыхтоўкай кадраў. І сёння нашы работнікі атрымліваюць адукацыю ў ВНУ. Як правіла, на завочных аддзяленнях. Прыходзяць да нас і маладыя спецыялісты — у асноўным, выпускнікі энергафака БНТУ і Віцебскага тэхналагічнага тэхнікума.

На прадпрыемстве дзейнічае пярвічка БРСМ, у якую ўваходзяць 90 чалавек. Кіраўніцтва станцыі падтрымлівае ўсе ініцыятывы нашай моладзі, дапамагае арганізоўваць масавыя мерапрыемствы, праводзіць спартыўныя, турыстычныя мерапрыемствы, суботнікі.

Істотную практычную дапамогу ў арганізацыі культурна-масавай работы аказвае аддзел культурна-масавай работы нашага Палаца культуры. Гэта і сустрэчы з цікавымі людзьмі, вечары адпачынку, кірмашы, дыскатэкі для моладзі. Сіламі калектыву Палаца ствараюцца выпускі радыёпраграмы «На гэтым тыдні», друкаванага інфармацыйнага бюлетэня «Энергія», арганізуюцца ўшанаванні перадавікоў і ветэранаў прадпрыемства.

Інжынера па навукова-тэхнічнай інфармацыі Святлану АСТРОЎСКУЮ фотааб'ектыў заспеў у бібліятэцы прадпрыемства.

Рамонтам-наладкай кантрольна-вымяральных прыбораў занятыя электраслесары Віктар ДОЛГІЙ і Юрый БУЛАХАЎ.

Начальнік змены электрацэха Барыс ЖУКОВІЧ.

Старшыня прафсаюзнага камітэта Лукомльскай ДРЭС Васіль НОВІКАЎ:

«НАВАТ ЗА ВАРОТАМІ ПРАДПРЫЕМСТВА НАШЫ РАБОТНІКІ НЕ ЗАСТАЮЦЦА САМ-НАСАМ СА СВАІМІ ПРАБЛЕМАМІ»

— РАБОТНІКІ Лукомльскай ДРЭС маюць даволі істотныя сацыяльныя льготы, замацаваныя ў працоўным дагаворы. Прадпрыемства аплачвае не менш за 30 працэнтаў кошту путёвак у санаторыі і прафілакторыі. Работнікі, занятыя на работах з асаблівымі, так званымі шкоднымі, умовамі працы, маюць дадатковы адпачынак да 14 каляндарных дзён. На тэрмін гэтага адпачынку пуцёўка для аздараўлення прадастаўляецца за 10 працэнтаў ад яе кошту. У прафілакторыі ДРЭС работнікі адпачываюць за 15–50 працэнтаў кошту пуцёўкі, пенсіянеры прадпрыемства — за 10–50 працэнтаў кошту. Вялікая дапамога аказваецца ў выпадку цяжкіх захворванняў. Прадпрыемствам заключаны і дзейнічаюць дагаворы на правядзенне абследвання работнікаў з Віцебскім медуніверсітэтам, Віцебскім дыягнастычным цэнтрам, чыгуначнай бальніцай.

Мы маем свой дзіцячы лагер адпачынку на 240 месцаў. Тут адпачываюць дзеці не толькі работнікаў ДРЭС, але і ўсёй сістэмы «Віцебскэнерга». Частка месцаў рэзервуецца для дзяцей работнікаў бюджэтнай сферы. Дзеці адпачываюць у тры змены, кожная з якіх доўжыцца 21 дзень. Нашы работнікі аплачваюць 15 працэнтаў ад кошту пуцёўкі. Ёсць катэгорыі людзей, і іх даволі многа, якім пуцёўкі прадастаўляюцца бясплатна.

Не застаюцца без увагі і ветэраны прадпрыемства — больш за 900 чалавек. Гэта і штомесячная матэрыяльная дапамога да пенсіі і пратэзаванне зубоў, і даплаты на паслугі афтальмолага, да юбілею. Акрамя таго, дапамагаем з рамонтам жылля, сельгасработамі. Асаблівай увагай акружаны ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

Усіх маладых спецыялістаў забяспечваем месцамі ў інтэрнаце. Фактычна гэта нават не пакоі, а малагабарытныя кватэры. Дзякуючы дзяржаўнай праграме развіцця малых гарадоў, і ўласнае жыллё — цалкам дасягальная і пад'ёмная мэта.

Усё мы жывём на зямлі, таму вельмі дарэчы прыходзіцца дапамога прадпрыемства сваім работнікам аўтатранспартам. Двойчы на год кожны ахвотны можа ім скарыстацца за 50 працэнтаў кошту паслугі. Бясплатна наладжаны падвоз у прафілакторый, на абследаванне ў медыцынскія ўстановы, экскурсіі.

У абедзвюх нашых гандлёвых кропках работнікі станцыі могуць атаварвацца без грошай — у лік будучай зарплаты.

Сябруюць на прадпрыемстве і з фізкультурай і спортам. Каманда Лукомльскай ДРЭС — у прызёрах усіх галіновых алімпіяд і спаборніцтваў. Прычым і на вышэйшую прыступку п'едэстала ўзнімаецца часцей за іншых. Многія работнікі станцыі наведваюць спартыўны комплекс прадпрыемства. Праўда, у сённяшніх умовах перавесці на рыначныя рэйкі давялося і фізкультуру: заняткі даводзіцца аплачваць, хоць і з 50 працэнтнай зніжкай. Бясплатнае наведванне залы засталося ў членаў зборных каманд станцыі, дзяцей і пенсіянераў.

Нам выпала рэдкая магчымасць зайсці ў топку парагенератара, калі ён спынены для правядзення планавага рамонту. У гэтай камеры памерам са шматпавярховы дом падчас працы тэмпература дасягае трох тысяч градусаў.

БЫЛІ ПЕРШАПРАХОДЦАМІ»

Лукомльская ДРЭС

Каля цэнтральнага шчыта кіравання начальнік змены станцыі Алег ЯКІМАЎ.

На ўчастку хімічнага цэха па ачыстцы вады. Тут працуе аператар пятага разраду Таццяна ВАЛАБУЕВА.

Сяргей СЕМЯНКОЎ, загадчык Палаца культуры энергетыкаў Лукомльскай ДРЭС:

«НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ПАВІННА ЗАНЯЦЬ СВАЮ ВЕЛЬМІ ВАЖНУЮ НІШУ Ў АДУКАЦЫІ І ВЫХАВАННІ»

На сцэне Палаца культуры энергетыкаў выступаюць самадзейныя спевакі, а ў файе разгорнута экспазіцыя твораў майстроў народных рамёстваў.

У 2005 ГОДЗЕ сярод буйных прафсаюзных і ведамасных палацаў культуры рэспублікі праходзіў конкурс у гонар 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у якім бралі ўдзел 24 установы культуры. У тым ліку такія гіганты, як МАЗ, МТЗ, а таксама Палац культуры чыгуначнікаў, Палац культуры прафсаюзаў рэспублікі, Палац культуры ветэранаў, «Магілёўхімвалакно»... Прафесійнае журы ацэньвала гадзінную канцэртную праграму, прадстаўленую кожным Палацам культуры. Гран-пры тады ў мінчан «увёў» Палац культуры энергетыкаў з Новалукомля, чым многіх проста па-добраму шакіраваў.

Кіруе калектывам Палаца культуры Сяргей СЕМЯНКОЎ, кампазітар, член Беларускага саюза музыкальных дзеячаў, член Рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па прысуджэнні званняў у галіне самадзейнай творчасці.

— Асноўнай дзейнасцю Палаца культуры з'яўляецца развіццё мастацкай творчасці сярод работнікаў Лукомльскай ДРЭС і членаў іх сем'яў, прыцягненне іх да ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці, арганізацыя і правядзенне канцэртаў, тэатральных і іншых мерапрыемстваў, — адзначыў Сяргей Віктаравіч. — З 20 нашых творчых клубных аб'яднанняў тры носяць ганаровае званне «народны» і «ўзорны».

Сярод калектываў з назвай «народны» — узорны ансамбль танца «Светлячок». Гэта своеасаблівая візітоўка нашага Палаца культуры. Ансамбль сёння — гэта каля 110 дзяцей, якія займаюцца ў трох узроставых групах. Тым самым забяспечваецца пераемнасць. Увогуле гэты дзіцячы калектыў з вялікімі традыцыямі — аднагодка Палаца: сёлета яму спаўняецца 33 гады. «Светлячок» гастраліраваў па Еўропе, прадстаўляў нашу Беларусь у Амерыцы.

Другі дзіцячы калектыў — узорная студыя эстраднай песні «Ля-ля-фанька». Кіраўнік — чалавек Чашніччыны-2010 Лідзія Дзімідчык. Калектыў браў удзел у многіх рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях. Гэта і «Халі-хало», «Зорная ростань», «Тэлебом», «Усе мы родам з дзяцінства»... Удзельнікі «Ляля-фанькі» былі адзначаны нават кіраўніком дзяржавы.

Народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Прамень» — калектыў дарослы. Удзельнікам ад 20 да 35-40 гадоў. У яго ўваходзяць танцавальная, інструментальная і вакальная групы. «Прамень» — таксама ўдзельнік і лаўрэат міжнародных і нацыянальных фестываляў і конкурсаў, сярод якіх «Іграй, гармонік!», «Славянскі базар», «Беларусь — мая песня», удзельнік рэспубліканскіх святаў «Дажынкі». Большасць з удзельнікаў калектыву — работнікі Лукомльскай ДРЭС.

Сярод вядучых калектываў — група эстраднага танца «Лонж», ансамбль песні «Калінка», хор ветэранаў, тэатральны калектыў «МЫ»... Нашы калектывы — сталыя ўдзельнікі святочных канцэртаў, прысвечаных усім дзяржаўным святам, Дню горада, прафесійнаму святу энергетыкаў, спартыўным турнірам... Кожную праграму мы імкнёмся зрабіць арыгінальнай, запамінальнай.

У гутарцы з Сяргеем Віктаравічам высветлілася, што і культуры сёння жывецца не лёгка. Аднак поўны пераход на рыначныя адносіны тут наўрад ці магчымы.

— Да нас прыходзяць людзі, каб у свой вольны час, пасля работы на той жа станцыі навучыцца спяваць, танцаваць. Ну як мы можам іх прымусіць недзе выступаць і зарабіць на іх грошы? Іншая справа, калі б гэта былі прафесійныя калектывы, куды людзі прыходзяць на працу і атрымліваюць зарплату.

Рашэннем кіраўніка дзяржавы нарэшце адменена давядзенне платных паслуг па культуры. Лічу, што гэта адзіна правільнае рашэнне для нашай сферы. Бо культура паступова пачала адыходзіць на другі план, а палацы культуры пачалі здавацца ў арэнду пад бізнэс... Усё ж такі ў нас іншае прызначэнне — перш за ўсё, духоўнае выхаванне нацыі, перадача народных традыцый новым пакаленням. Народная творчасць павінна заняць сваю вельмі важную нішу ў адукацыі і выхаванні, як гэта даўно склалася ў той жа Еўропе. У нас пакуль яшчэ гэта магчыма.

Тамара КОНЧЫЦ, начальнік аздараўленчага комплексу «Сасновы бор» філіяла Лукомльская ДРЭС:

«СУЧАСНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЕПШЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ І ЛЕКАВАЯ СІЛА ПРЫРОДЫ»

У аздараўленчым комплексе «Сасновы бор». Начальнік комплексу Тамара КОНЧЫЦ і медсястра фізіятэрапіі Людміла РЫДЛЕВІЧ прапанавалі зрабіць фотаздымак у кабінеце падводнага душу-масажу і ў зале спартыўных трэнажораў.

— НАШ прафілакторый пабудаваны яшчэ ў 1978 годзе для аздараўлення работнікаў «Віцебскэнерга». Энергетыкі атрымалі магчымасць умацоўваць здароўе без адрыву ад вытворчасці — прыязджаць на працэдуры ўвечары, па завяршэнні працоўнага дня. Мы захавалі гэтую сістэму і сёння. З той толькі розніцай, што зараз прапануем свае паслугі не толькі энергетыкам, але і любым грамадзянам, у тым ліку і грамадзянам іншых краін. У наш прафілакторый прыязджаюць, галоўным чынам, расіяне, аднак едуць таксама з Украіны, Латвіі, Ізраіля, Чэхіі. Як правіла, пра нас даведваюцца ад сваякоў-беларусаў або праз інтэрнэт.

Прафілакторый аказвае сёння вельмі шырокі спектр фізіятэрапеўтычных паслуг, прычым як даўно вядомых, так і новых. Фізіятэрапія — немедыкаментозны від лячэння, які фактычна не мае проціпаказанняў і пабочных эфектаў, і таму мы надаём вельмі вялікую ўвагу развіццю гэтага накірунку. Дарэчы, я сама па спецыяльнасці фізіятэрапеўт, і кожныя тры гады наведваю курсы павышэння кваліфікацыі...

Каля 80 працэнтаў нашых работнікаў маюць павышаны артэрыяльны ціск. Таму перш за ўсё мы робім акцэнт на лячэнні менавіта сардэчна-сасудзістых захворванняў. Аднак ёсць у нас і цудоўнае абсталяванне для лячэння страўнікава-кішачных хвароб, хвароб нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарату.

На тэрыторыі прафілакторыя размяшчаюцца дзве свідравіны з прыроднай мінеральнай вадой. Адна свідравіна дазваляе атрымліваць пітную ваду — сульфатна-хларыдна-кальцыева-натрыевую, сярэдняй мінералізацыі. Ужыванне такой вады паказана найперш для лячэння хвароб страўнікава-кішачнага тракту. Другая свідравіна дае мінеральную ваду, якая дазваляе прымаць лекавыя ванны, якія, напрыклад, паляпшаюць сон. Акрамя мінеральных, ёсць у нас і глазевыя ванны, глазевыя аплікацыі, якія паказаны пры цэлым шэрагу захворванняў. Наогул мы прапануем самыя розныя водныя працэдуры: напрыклад, ручны падводны масаж, які выконваецца ў ванне; ванны жамчужныя, з аксідатам торфу, хвойныя, валяр'янавыя. Ёсць у нас і крыяапарат, які можа не толькі здымаць боль і ацёк. Холад цудоўна лечыць суставы.

З ліку новых відаў лячэння — установка «Рэабокс» для сухіх вуглякіслых ваннаў. Установка была набыта чатыры гады таму, і за гэты час мы неаднойчы пераканаліся ў тым выдатным эфекце, якога яна дазваляе дасягнуць у пацыентаў з паталогіямі сасудаў. «Рэабокс» нармалізуе артэрыяльны ціск, паляпшае кровазварот.

Летась мы атрымалі нямецкі ложак «Бенертэрапія», які стварае нізкаінтэнсіўнае магнітнае поле. Лежачы на такім ложку, пацыент амаль нічога не адчувае, але эфект для сасудаў атрымлівае таксама выдатны.

Карэйскі ложак «Нугабест» забяспечвае ролікавы масаж з аднаасовым расцягваннем цягліц спіны — ён эфектыўны пры праблемах з пазваночнікам. Вельмі важна, што ніякіх проціпаказанняў і пабочных эфектаў вышэйназваныя працэдуры не маюць.

У бліжэйшай перспектыве мяркуем развіваць вельмі актуальны зараз касметалагічны накірунак. З гэтай мэтай можам на прымяняць і вышэйзгаданы крыяапарат. У хуткім часе адкрыем і асобны касметычны кабінет, які абавязкова будзе карыстацца вялікім попытам.

Такі накірунак, як СПА-працэдуры, зараз вельмі інтэнсіўна развіваецца ў свеце, і мы імкнёмся не адставаць. Увесь мінулы год мы займаліся падрыхтоўкай да пачатку работы СПА-кабінета. Апарат, які набылі для гэтай мэты, дазваляе ствараць інфрачырвоную або паравую сауны, забяспечваць ароматэрапію, хроматэрапію, музыкатэрапію, веерны душ, масаж... Паступова мы пачнём выкарыстоўваць гэты апарат для правядзення эстэтычных працэдур — зніжэння вагі, амаладжэння.

Наш аздараўленчы комплекс прапануе адпачынак і лячэнне на любую колькасць дзён. Выгадна адрозніваемся ад санаторыяў тым, што не ўключаем у кошт пуцёўкі медыцынскія паслугі. Кліенту не трэба плаціць за тое, што ўключана ў пуцёўку паміма яго волі: заплаціў за тое, чым захацеў карыстацца.

Нумары ў нас пераважна блочныя, у двух пакоях па два чалавекі. Але мы імкнёмся ствараць і аднамесныя нумары. Усе нумары адрамантаваныя, у добрым стане. За дадатковую плату можна наведваць більярд, саўну, басейн. Вялікія намаганні мы накіроўваем сёння на тое, каб у нашым кампактным прафілакторыі было пахатняму камфортна, каб нашы госці і пацыенты прыязджалі да нас зноў і зноў, што, дарэчы, і адбываецца.

...Ад нашай невялікай журналісцкай каманды адзначым, што гасціннасць і ўтульнасць прафілакторыя энергетыкаў сапраўды ўражваюць. Некаторыя з нас пачалі разглядаць магчымасць правядзення часткі бліжэйшага адпачынку на беразе маляўнічага Лукомльскага возера.

Сяргей ПРОТАС,
Віктар ПАЗНЯКОЎ,
Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 300231390.

Памяшканне бібліятэкі ўпрыгожваюць карціны мясцовых мастакоў.

Экскурсію ў музеі гісторыі Лукомльскай ДРЭС праводзіць метадыст Алена ЯКІМЦОВА.

Минский районный исполнительный комитет *23 июня 2011 года* повторно проводит открытый *аукцион* на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

		Лот 1	Лот 2
1	Адрес земельного участка	Минский район, Боровлянский с/с, д. Слободщина	Минский район, Луговослободской с/с, район п. Привольный
2	Кадастровый номер	623680608101000084	623684100001000322
3	Площадь земельного участка	0,1257 га	1,5584 га
4	Срок аренды (лет)	99	51
5	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства административных и производственно-складских зданий и подъездной автомобильной дороги к ним
6	Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)	–	4 268 000
7	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 665 539	2 063 460
8	Начальная цена права заключения договора аренды	2 869 долларов США	43 049 долларов США
9	Задаток (рублей)	1 400 000	20 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **23.06.2011 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **17.06.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600052345.

На Лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641000233719, отделение № 537, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества ЗАО Выставочный центр «Аквабел» Минский район:

№ лота	Наименование объекта аренды	Адрес объекта аренды	Арендуемая площадь, м²	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Изолированное помещение (инвентарный номер 600/D-29444, помещение общественного питания (ресторан)	Минский район, р-н д. Боровая, 1-102	413,8	10 000 000	3 000 000
1-й этаж общей площадью 286,1 м², в том числе зал ресторана 150,7 м², подсобное помещение (кухня) – 135,4 м², цокольный этаж (подсобные и технические помещения) – 127,7м²					

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся **28.06.2011 года в 10.00**, по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5%** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом аренды;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Обязательные дополнительные требования к претендентам на участие в аукционных торгах:

Претенденты на участие в торгах перед перечислением задатка обязаны связаться с организатором аукциона и представить материалы, свидетельствующие о том, что претендент соответствует указанным обязательным дополнительным требованиям. Если претендент соответствует этим обязательным дополнительным требованиям, то он получает согласие организатора торгов на перечисление задатка, а также может ознакомиться с объектом аренды.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012000273011 в ф-ле ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 115 г. Минск, ул. Кропоткина, 91, код 749, УНН 600438617.**

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона должен не позднее дня, следующего за днем проведения аукциона, после окончания торгов подписать протокол о результатах аукциона. Протокол подписывается в двух экземплярах победителем аукциона и членами аукционной комиссии.

Оплата стоимости приобретенного права заключения договора аренды на объект недвижимости осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

Победитель аукциона заключает договор на аренду нежилого помещения в течение 5 (пяти) банковских дней с момента исполнения обязательств по оплате стоимости лота.

Срок договора аренды нежилого помещения – **3 (три) года.** Арендная ставка с НДС за один квадратный метр в месяц без эксплуатационных расходов на арендуемое помещение и без эксплуатационных расходов на помещения общего пользования: **ЛОТ № 1 – 10 (десять) у.е.** за изолированное помещение (инвентарный номер 600/D-29444, помещение общественного питания (ресторан) площадью **413,8 кв.** Одна у.е. равна стоимости одного евро, выраженной по курсу Национального банка Республики Беларусь. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются **до 27.06.2011 г. до 12.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. Тел. (017) 237 91 32, 237 93 73.

Филиал ОАО «Борисовская Агропромтехника» Борисовского района Минской области

ПРИГЛАШАЕТ НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ:

- ✓ главного инженера-механика
- ✓ инженера-механика
- ✓ зоотехника
- ✓ агронома

Оплата труда достойная, предоставляется благоустроенное жилье.

Тел.: 8 01777 79 014 – отдел кадров, 79 010 — приемная.

УНП 601058075

Жыллё

НАВАСЁЛЫ НЕ ХОЧУЦЬ ЧАКАЦЬ

КДК Магілёўскай вобласці спрабуе палегчыць афармленне ва ўласнасць кватэр у новых дамах і іх засяленне.

Жыллёвае будаўніцтва — гэта адно з самых актуальных пытанняў жыцця людзей, усюды і заўсёды. У Магілёўскай вобласці Камітэт дзяржаўнага кантролю пастаянна вядзе маніторынг, дзейнічае «гарачая лінія». Менавіта са зваротаў грамадзян магілёўскія спецыялісты КДК і выявілі актуальную для навасёлаў праблему.

— Людзі скардзяцца на немагчымасць пасля здачы ў эксплуатацыю шматкватэрных дамоў хутка аформіць правы ўласнасці на свае кватэры і пасяліцца ў іх, прычым на працягу доўгага часу, — паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення кантролю галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы КДК Магілёўскай вобласці Людміла НЕПАПУШАВА**.

Ёсць і красамоўныя прыклады. Жылы дом на 120 кватэр на вуліцы Фаціна ў Магілёве ўведзены ў эксплуатацыю ўлетку, але правы ўласнасці яго жыхары здолелі аформіць толькі ўвосень, праз 3 месяцы. Зацягнулі летась на квартал перыяд паміж здачай у эксплуатацыю і засяленнем людзей яшчэ у двух дамах — 120-кватэрным у Магілёве і 70-кватэрным у Горках. У Магілёве 72-кватэрны дом у новым мікрараёне «Спадарожнік» здалі яшчэ ў леташнім сакавіку, а вось уласнасць на кватэры можна было аформіць толькі праз 8 месяцаў, напрыканцы года. Іншыя прыклады падобныя, адрозніваюцца толькі тэрміны — ад 3-х да 9-ці месяцаў.

У Камітэце дзяржкантролю Магілёўскай вобласці ўважліва вывучылі праблему. Чаму ж так атрымліваецца? Справа ў тым, што для афармлення ўласнасці (і далейшага засялення) неабходны цэлы пакет дакументаў: 16 даведак, але ў частцы з іх змяшчаюцца звесткі пра кошт будаўніцтва жылля. Між тым, менавіта гэтая сума канчаткова фарміруецца пазней.

— Прычыны на гэта могуць быць розныя, у тым ліку і аб'ектыўныя, — расказала Людміла Непапушава. — Калі дом здаецца ўзімку, то заканадаўства дае магчымасць перанесці некаторыя віды работ, як правіла — вонкавае аздабленне і добраўпарадкаванне, на больш спрыяльны перыяд. Таму канчатковы кошт можна атрымаць толькі ўлетку, засяленне даводзіцца адкладаць на вялікі тэрмін.

Такім чынам, гэта не проста валакіта, якую трэба выкараніць. Праблема патрабуе вырашэння на рэспубліканскім узроўні. Бо скаргі людзей цалкам абгрунтаваныя, гавораць у КДК. Па-першае, яны пабудавалі новае жыллё і хочуць у ім жыць, але не могуць стаць навасёламі з прычыны адсутнасці патрэбных папер. Другая акалічнасць датычыцца грошай.

— Казус у тым, што калі людзі не жывуць у кватэрах, яны павінны плаціць за жыллёва-камунальныя паслугі, — адзначае Людміла Непапушава. — Прычым па павялічаных тарыфах, таму што рахункі выстаўляюцца не фізічнай, а юрыдычнай асобе — жыллёва-будаўнічаму кааператыву. Кааператыў жа лагічна патрабуе ад сваіх удзельнікаў поўнай кампенсацыі. Усё гэта кладзецца непрыемным цяжарам на плечы ці, дакладней, кішэні людзей.

— Мы мяркуем, як і органы інвентарызацыі, што няма вострай неабходнасці ўва ўсіх даведках, і асобныя з іх, якія змяшчаюць інфармацыю пра кошт будаўніцтва, якраз можна было б перанесці на больш позні тэрмін, — гавораць Людміла Непапушава.

У КДК паведамілі, што сітуацыю з новапабудаванымі дамамі і наваселлямі неабходна прааналізаваць ва ўсёй краіне, і толькі пасля гэтага выйсці да Савета Міністраў з прапановай удасканалення заканадаўства ў сферы афармлення новапабудаваных кватэр ва ўласнасць грамадзян.

Ілона ІВАНОВА.

Крымінал, здарэнні

ПАД ТРУБАМІ ЦЕПЛАТРАСЫ ЗАХРАС... ЛОСЬ

Дакладней, заблакаваний аказалася самка ва ўзросце да двух гадоў. Адбылося гэта ў суботу пасля 18 гадзін на вуліцы Свіслацкай у сталіцы — у раёне ачышчальных збудаванняў.

Пра здарэнне ў цэнтр аператыўнага кіравання пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паведамілі работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Яны і ўсыпілі і абезруховілі жывёліну, а работнікі МНС зрабілі падкоп. Праз дзве гадзіны самку лася вызвалілі з «палону».

Сяргей РАСОЛЬКА.

П'ЯНЫЯ ЎЦЁКІ

12 чэрвеня ўначы пад Магілёвам п'янага кіроўцу ўдалося спыніць толькі стрэламі па колах.

Як паведамілі ў Магілёўскай ДАІ, кампанія маладых людзей з Быхава прыехала ў абласны цэнтр, каб павесяліцца ў начным клубе. П'яныя і задаволеныя, восем чалавек (большасці — толькі 18 гадоў) загрузіліся ў «Міцубісі» і рушылі дадому. Але нецвярозым аказаўся і 26-гадовы вадзіцель, які ўжо быў пазбаўлены правоў з прычыны п'янства за рулём. Спыніць аўтамабіль на начных вуліцах горада супрацоўнікі ДАІ спрабавалі некалькі разоў, аднак кіроўца толькі дадаваў газу. У выніку давялося ўжыць надзвычайныя меры: пад вёскай Красніца Магілёўскага раёна стрэлілі ў паветра, а потым па колах. Цяпер кіроўцу за п'яныя ўцёкі пагражаюць не проста буйныя штрафы, але і крымінальны пераслед.

Ілона ІВАНОВА.

ПАНІКОЎСКІ ПРАДАСЦЬ УСІХ, АЛЕ ДАРАЖЭЙ

Маленькага парсючка вагой 9 кг выкраў у гаспадыні сярод белага дня непрацуючы жыхар вёскі Старая Рудня Жлобінскага раёна. Жывёлку атрымалася вярнуць на месца, у адрозненне ад трох трусоў, якія зніклі ў невядомым напрамку ў Жлобінскім раёне. Дарэчы, для таго, каб ажыццявіць свой план, невядомы ноччу пранік у памяшканне праз праламаны дах. 30 куранят у вёсцы Броніца Буда-Кашалёўскага раёна выкралі з хлява таксама ноччу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Падпіска-2011

У ГОСЦІ ДА ЗВЯЗДОЎСКІХ ШЧАСЛІЎЧЫКАЎ

Рэдакцыя газеты «Звязда» працягвае радаваць сваіх падпісчыкаў каштоўнымі падарункамі, якія яны выйгралі па выніках падпіскі на першае паўгоддзе 2011 года.

Чарговы «выезд у народ», быў, бадай, найбольш ёмкім, бо ўмясціў у сябе адразу чатыры вобласці. Зразумела, што колькасць сустрэч на паштовых вузлах сувязі, райвыканкамах і проста на вуліцы аказалася надзвычай шматлікай. Але ж нават з улікам 30-градуснай спякоты вялікай стомленасці ад больш чым 1000-кіламетровага маршруту не адчуваеш, бо за кожнай размовай і аўдыенцыяй — жывыя людзі. Са сваімі настроем і аўрай. Часцей добрай, ад чаго энергіі толькі прыбаўляецца.

Міншчына традыцыйна становіцца стартавай пляцоўкай падпісных кампаній у выязным варыянце. І на гэты раз пачатак быў дадзены ў Стоўбцах. Далей — Гродзеншчына. Калі ў Карэліцкім раёне ўсё прайшло ў фармаце візіту ветлівасці, бо прызы на гэты раз прайшлі міма падпісчыкаў з гэтага рэгіёну, то Навагрудчына традыцыйна аказалася ў плюсе. Наша даўняя падпісчыца Людміла Бахар «разжылася» адразу каляровым тэлевізарам «Віцязь». Зразумела, што настрой у начальніка мясцовага РВПС Святланы Дзедавец быў прыўзняты. Яшчэ б: штоквартал старэйшае беларускамоўнае выданне прывозіць у раён каштоўныя прызы сваім падпісчыкам, і вельмі часта тэлевізары. На гэты раз жыхарка Навагрудка, якая «сябруе» з нашай газетай больш за дзесяць гадоў, не магла нарадавацца, што ўдача нарэшце ёй усміхнулася. У размове з журналістам «Звязды» Людміла Яўгенаўна расказала, што вельмі любіць чытаць па-беларуску.

Радасць поспеху са звяздоўскай лаўрэаткай раздзяліла галоўны спецыяліст ідэалагічнай работы Навагрудскага райвыканкама Ірына Ходар **(фота 1).**

Ужо ў першы дзень прызавую эстафету прыняла Брэсцкая вобласць. Хоць падпісчыкі абласнога цэнтра на гэты раз аказаліся не ў спісе шчасліўчыкаў, тым не менш, тутэйшыя сустрэчы з намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанідам Цупрыкам, кіраўніком ўпраўлення ідэалагічнай работы Аляксандрам Цыральчуком, дырэктарам Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Валянцінай Пух аказаліся надзвычай плённымі і карыснымі. У любым выпадку з нашага боку ўсе дамоўленасці па аднаўленні і павелічэнні падпіскі ў рэгіёне былі пацверджаны ўручэннем каляровага тэлевізара «Віцязь» на Лунінеччыне — жыхару вёскі Вулька-2 Уладзіміру Паўловічу. З улікам таго, што наша прыезд на Палессе, дзе спякота ўжо паспела нарабіць нямала бяды, супаў з надзвычай высокай тэмпературай на вуліцы і ад сонца не было куды схавацца, фотасесію з удзелам самога пераможцы (а Уладзімір Мікалаевіч адданы «Звяздзе» ўжо больш за 30 гадоў), начальніка Лунінецкага РВПС Ніны Дударгі і галоўнага спецыяліста аддзела ідэалагічнай работы Лунецкага райвыканкама Ганны Паўлюкевіч **(фота 2)** вырашана было правесці ў цяні векавой елкі, якая ўдала ўпрыгожвае прыродны ландшафт «Белпошты». Што называецца, выкруціліся!

Стомленыя, але з прыўзнятым настроем, бо на сваім маршруце даставілі простым людзям нямала прыемных і радасных імгненняў, праз Жыткавіцкі раён Гомельшчыны мы трымалі курс зноў на Міншчыну. У Любанскім раёне мікрахвалевую печ ужо зачакалася наша даўняя падпісчыца з вёскі Баянічы Марыя Жур. Відавочна, што з-за вялікай занятасці па гаспадарцы Марыя Васільеўна не змагла прыехаць на сустрэчу. Але ж начальнік Любанскага раённага вузла паштовай сувязі Людміла Патапенка запэўніла, што ў самы бліжэйшы час каштоўны прыз будзе дастаўлены адрасату. Трэба меркаваць, што самы непасрэдны ўдзел ва ўрачыстым уручэнні падарунка прыме і аператар сувязі мясцовага РВПС Таццяна Лагун **(фота 3),** якая пацвердзіла, што «мікрахвалёўка» — вельмі патрэбная рэч любой кемлівай і спагадлівай гаспадыні.

Мы ж у гэтым і не сумняваліся. І заклікаем сваіх падпісчыкаў і надалей удзельнічаць у звяздоўскім штоквартальным розыгрышы. У любым выпадку чалавек, які аформіў падпіску на старэйшае беларускамоўнае выданне, нічога не губляе. Калі прыз і не выпадзе — то аператыўная інфармацыя і карысныя матэрыялы на любыя густы яму будуць забяспечаны.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота аўтара.

Мінск — Стоўбцы — Карэлічы — Навагрудак — Дзятлава — Слонім — Пружаны — Камянец — Брэст — Драгічын — Іванава — Пінск — Лунінец — Любань.

«Бентлі» і «Лексус» сутыкнуліся ў цэнтры Мінска

АДЗІН З АЎТАМАБІЛЯЎ НАЛЕЖЫЦЬ МІХАІЛУ ЗАХАРАВУ?

Раніцай у нядзелю ў Мінску побач з праспектам Пераможцаў адбылося ДТЗ з удзелам двух элітных аўтамабіляў — рэстайлінгавага «Бентлі Кантыненталь» і «Лексус». Кіроўцы не пацярпелі, аднак цікава, што серабрысты «Бентлі», паводле шматлікіх крыніц, належыць знакамітаму хакейнаму спецыялісту Міхаілу Захараву.

Як паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Цэнтральнага РУУС сталіцы Анастасія Цыбіна, 12 чэрвеня каля 5.30 гадзін аўтамабіль Bentley Continental GT рухаўся па вуліцы Мельнікайтэ ў кірунку праспекта Пераможцаў. За рулём аўтамабіля знаходзіўся мужчына 1962 г. н. Падчас выбару хуткасці ён не ўлічыў стану транспартнага сродку і дарожных умоў — у выніку на закругленні дарогі не справіўся з кіраваннем. «Бентлі» занесла на палосу сустрэчнага руху, дзе ён сутыкнуўся з аўтамабілем Lexus LX 570. Кіроўцы абодвух аўтамабіляў не пацярпелі, а машыны атрымалі пашкоджанні. Прычыны і абставіны здарэння зараз высвятляюцца.

У ДАІ не сталі каментаваць факт прыналежнасці аўтамабіля хакейнаму трэнеру, таксама не агучылі вынікі медыцынскага агляду кіроўцаў, падкрэсліўшы толькі, што такія працэдуры, «згодна з заканадаўствам», праводзіліся.

ТЫМ ЧАСАМ

Тое, што аварыі з удзелам спартсменаў у нас здараюцца не так і рэдка, мы выдатна ведаем. Адно з апошніх гучных ДТЗ адбылося ў красавіку ў Наваполацку, калі за рулём загінуў чэмпіён Еўропы і свету сярод моладзі, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы Сяргей Лагун. У 6.20 раніцы яго «Пежо-206» вынесла з шашы на абочыну, дзе аўтамабіль урэзаўся ў дрэва. Пасажыр, яшчэ адзін наш цяжкаатлет Яўген Жарнасек, быў дастаўлены ў рэанімацыю. ДТЗ разглядалася на пасяджэнні выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта, дзе звярталася ўвага на дысцыпліну ў камандзе па цяжкай атлетыцы. Да гэтага неаднойчы п'яным за руль садзіўся яшчэ адзін член каманды, алімпійскі чэмпіён Андрэй Арамнаў. Міністр спорту Алег Качан наракаў на дысцыпліну ў камандзе, асабліва падчас дэцэнтралізаванай падрыхтоўкі, і папрасіў трэнераў не пакідаць без увагі сваіх падапечных.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

НЕЖАРТОЎНАЯ АВАРЫЯ

Спалучэнне слоў «Мерседэс» і «Запарожац» звычайна выклікае ўсмешку. Многія адразу ўспамінаюць жарты, анекдоты пра гэтыя аўтамабілі розных класаў. Зусім іншую рэакцыю будзе выклікаць згадка пра гэтыя машыны ў 24-гадовай мінчанкі, што 10 чэрвеня трапіла ў аварыю.

Трагедыя адбылася на 92-м кіламетры аўтадарогі «Мінск—Гродна» ў Іўеўскім раёне. Маладая жыхарка сталіцы толькі сёлета ў студзені атрымала пасведчанне кіроўцы. Яна рэдка садзілася за руль і таму не мае дастатковых навыкаў ваджэння. А на гэты раз, паводле папярэдняй інфармацыі, адцягнула ўвагу ад кіравання. На паласе разгону яе пазадарожнік урэзаўся ў спадарожны «Запарожац».

Магутным ударам джып «Мерседэс» вагой больш за тры тоны змяў малалітражны аўтамабіль і, надаўшы паскарэнне, скінуў яго ў кювет. 62-гадовы кіроўца «Запарожца», які, хутчэй за ўсё, вяртаўся з працы, памёр на месцы. Першапачаткова дама сказала, што не зразумела, ехаў той аўтамабіль або стаяў, паколькі падымала акуляры, якія ўпалі. Потым заявіла, што «Запарожац» выехаў на яе паласу руху. Прычыны ДТЗ высветліць следства, а пакуль заведзена крымінальная справа, і сярод іншых пакаранняў адпаведным артыкулам кодэкса прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін да пяці гадоў.

Алег ДУК, старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Совместное общество с ограниченной ответственностью «Интерспортпроект» (до перерегистрации – ИП «Интерспортпроект») ИНФОРМИРУЕТ ФИЗИЧЕСКИХ И ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ О СОЗДАНИИ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Информация о застройщике:
Застройщик: Совместное общество с ограниченной ответственностью «Интерспортпроект» (до перерегистрации – ИП «Интерспортпроект») зарегистрировано Мингорисполкомом 04.12.2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 600437529.
Юридический адрес: 220035, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Игнатенко, д. 11, к. 6.
Режим работы: 9.00–18.00, обед: 13.00–14.00, выходные: суббота, воскресенье; работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.
Предприятием построен 69-квартирный жилой дом, расположенный в г. Минске по ул. Одоевского, 54а общей площадью 5018 м.кв.

Информация о проекте:
Цель строительства – реализация инвестиционного проекта по застройке жилого квартала в Заводском районе г. Минска в границах улиц Одесская – Лазо – Ушакова – Котовского – Челюскинцев. 1-я очередь строительства.

Объект долевого строительства – крупнопанельный, односекционный, 19-этажный жилой дом серии М111-90 № 5 по генплану со встроенными помещениями.

Строящийся дом расположен в непосредственной близости с Партизанским проспектом и станцией метро «Автозаводская», рядом с ЧУО «Минский Институт Управления».

На первом этаже размещены встроенные помещения административно-общественного назначения с отдельным входом с улицы.

Дом оснащен техническим подпольем и чердаком, а также технической надстройкой на кровле, завершающейся индивидуальным архитектурным решением.

Жилой дом оборудован мусоропроводом и 2-мя лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг с лифтовыми холлами. Для маломобильных групп населения предусмотрено устройство пандусов при входах во встроенные помещения административного назначения.

Наружная отделка – покраска акриловой краской с использованием единого цветового решения, определяющего застройку квартала.

Наружные стены выполнены из 3-слойных железобетонных панелей с утеплителем из полистирольного пенопласта.

На входе в подъезд – двери металлические усиленные со смотровым отверстием-окном из закаленного стекла, в квартиры – двери деревянные усиленные. Высота жилых помещений (пол-потолок) – 2,6 метра.

Категория комфортности по шуму – «В». Предусмотрена звукоизоляция между шахтами лифта, стволом мусоропровода и конструкциями здания.

Окна и балконные двери – из профиля ПВХ с двухкамерными стеклопакетами. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные лоджии), а также минимально допустимый набор отделочных работ и оборудования.

Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация – городские сети.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи, подвалы и другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых помещений, но обеспечивающее жизнедеятельность жилой части дома, элементы озеленения и благоустройства, относящиеся к жилой части дома, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось всеми дольщиками.

Благоустройство территории включает озеленение, устройство тротуаров, дорожек, детской и хозяйственной площадок, устройство парковки.

Объемно-планировочные показатели: Общая площадь жилого дома – 8962,14 кв.м.

Общая площадь квартир в жилом доме – 7154,32 кв.м.

Сроки начала строительства – ноябрь 2010 г.

Срок ввода объекта в эксплуатацию: декабрь 2011 г.

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:

- государственную экологическую экспертизу (заключение Минприроды РБ от 21.04.2008 г. № 139);
- государственную экспертизу (заключение РУП «Госстройэкспертиза по городу Минску»:
- по проекту застройки от 31.06.2008 г. № 0621-8-2008;
- по проекту жилого дома № 5 по генплану от 31.07.2008 г. № 0620-8-2008, с дополнением к заключению от 08.10.2009 г. № 1346-8-2009;

Разрешение на организацию строительной площадки для строительства жилого дома № 5 по генплану от 18.11.2010 г. № 2-201Ж-053/10 и на строительство жилого дома № 5 по генплану от 2.12.2010 г. № 2-201Ж-053/10.

Генеральным подрядчиком по строительству объектов является ОАО «МАПИД».

Застройщику в постоянное пользование предоставлен земельный участок согласно решению Мингорисполкома от 11.09.2008 № 2115 для строительства и обслуживания жилых домов:

- № 4 и № 5 по генплану – общей площадью 0,1624 га.

Застройщиком получены:

- Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него:
- от 22.09.2010 г. № 500/1239-406.

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается две двухкомнатные и две трехкомнатные квартиры.

По состоянию на дату опубликования проектной декларации стоимость 1 кв.м на квартиры в доме № 5 по генплану составляет:

- *двухкомнатные квартиры – 4 070 000 руб.;*
- *трехкомнатные квартиры – 3 700 000 руб.*

Ознакомление дольщиков с объектами долевого строительства и условиями заключения договоров долевого строительства производится по адресу: г. Минск, ул. Игнатенко, д. 7, комната 11.

Телефон: (017) 203 38 07.

Гасцініца на 120 месцаў.

ВЯРХОМ НА КАНІ Ў ЕЎРОПУ

У Ратамцы праводзяцца спаборніцтвы рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню.

БЕЛАРУСКІМІ ТРАКЕНАМІ ЗАЦІКАВІЛАСЯ ГЕРМАНІЯ

20 хвілін на маршрутцы (ці электрычцы) — і вы патрапіце ў іншы час. У мінулае — бо ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі можна сустрэць цудоўных коней тракененскай пароды, продкі якіх жылі пры каралеўскіх дварах, запрагаліся ў карэты, альбо ўдзельнічалі ў войнах, цягалі гарматы. А можа, вы патрапіце ў будучыню — конны спорт паступова развіваецца ў нашай краіне і ахвотных мець уласнага коніка таксама становіцца ўсё больш.

Між іншым, конны спорт, напрыклад, у Германіі — адзін з самых папулярных відаў разам з футболам і боксам, і білеты на такія спаборніцтвы раскупляюцца за год. Конская галава у Германіі (як і ў Бельгіі ці Галандыі) выглядае ці не з кожнага двара. Каня ўспрымаюць як члена сям'і. Пасля працы гаспадары выбіраюцца адпачываць са сваімі капытнымі сябрамі — вывозяць іх на канявозцы. Коні перабіраюцца нават у горад. Напрыклад, у Бельгіі ім аддалі цэлую вуліцу.

Толькі пагалоўе племянных матак розных парод у Германіі — каля 280 тысяч! У нас лічбы куды больш сціплыя. На ўсю Беларусь племянных кабылак набярэцца не больш за некалькі соцень. І тым не менш, як лічыць галоўны заатэхнік Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі Віктар Малашка, у Беларусі ёсць неблагія шанцы, яна можа дастойна заявіць пра сябе: «У нашых коней неблагі патэнцыял. Мы можам вырошчваць добры маладняк і рэалізоўваць ва ўсе краіны свету. Трэба толькі не замыкацца ўнутры краіны. І мы акенца ў Еўропу ўжо пачалі пакрысе адчыняць. Нас ужо ведаюць, у нас ёсць перамогі. Па выніках выступленняў беларускіх коней у вялікім спорце наш конны завод імя Л. Даватара займае ў рэйтынгу конных заводаў шостае месца».

Скакуноў з Ратамкі ведаюць як у блізкім, так і далёкім замежжы. Расія, Украіна, Прыбалтыка выкарыстоўваюць коней, набытых у Беларусі, у племянной працы, ганарацца імі. Напрыклад, Паладыум — адзін з коней, вырашчаных у нашай рэспубліцы. Сёння гэта гонар Эстоніі, пра яго нават здымалі фільм. Штогод коні з Ратамкі выстаўляюцца на міжзаводскіх выпрабаваннях, прычым, напрыклад, у Расіі беларускі маладняк заўсёды займае першыя месцы. Нашы коні «зарэкамендавалі» сябе і ў Польшчы. Больш за тое, беларускіх коней прызнала краіна, заканадаўца ў галіне конегадоўлі, — Германія.

Ветклініка аснашчана сучасным абсталяваннем.

СВЕЖАЯ КРОЎ

Калі немцы прыехалі ў Беларусь, яны былі ў захапленні ад коней, якіх пабачылі. Конезавод імя Л. Даватара спецыялізуецца на развядзенні тракененскай пароды.

Гэтая парода была выведзена ва ўсходняй Прусіі і з'яўлялася гордасцю Германіі. Конезавод у мястэчку Тракенен быў створаны ў 1732 годзе. «Тракены» былі ў лепшых дварах Еўропы. Калі пачаў развівацца конны спорт, гэтыя скакуны станавіліся чэмпіёнамі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны «тракены» былі вывезены ў Савецкі Саюз, частка матачнага пагалоўя трапіла ў Беларусь.

Сёння «тракены» ў Германіі адрозніваюцца ад тых, што захаваліся ў Беларусі. Дзякуючы племянной працы ў нашай краіне захаваны старатракененскія лініі. У Германіі ж кроў перамешана, там вядзецца паляванне за свежай крывёю, і немецкіх спецыялістаў зацікавілі лініі, якія захаваліся з XVI, XVII стагоддзя і ёсць у Беларусі.

У выніку перамоў Беларусь была прынята ў Вестфальскі саюз коневыт-ворцаў. На безграшовай аснове праведзены абмен. Сюды завезены нямецкія каняматкі, якія ўжо далі жарабят, а за мяжу паехалі 5 беларускіх кабыл, якія ўжо пакрыты лепшым жарабцом Германіі. Таксама сюды завезены ліцэнзійны нямецкі жарабец. Атрыманыя такім чынам жарабяты будуць мець нямецкія дакументы, і наш конезавод напалову становіцца нямецкім, што, у сваю чаргу, дае магчымасць нашай краіне ўдзельнічаць у кёрнах у Германіі.

Вось яно адчыненае акенца ў Еўропу! Вось ён імідж краіны! Між іншым, развіццё коннага спорту і конегадоўлі сведчыць пра эканамічнае развіццё краіны. Трымаць коней — дарагое задавальненне, і справа не толькі ў кармах. Дарэчы, Рэспубліканскі цэнтр сам займаецца іх вырошчваннем, прычым асноўныя віды кармоў — сена (яно павінна быць толькі першага класа) і авёс (у гаспадарцы атрымліваюць да 50 цэнтнераў з гектара). Нават каб падкаваць каня, трэба за раз выкласці не менш 30 долараў. Плюс вельмі дарагія «аксесуары»: толькі цыліндрык, у якім выступаюць спартсменкі, можа каштаваць ад 100 да тысячы еўра; сядло — пачынаючы ад 300 еўра; а яшчэ неабходны брыджы, боты і гэтак далей. Дарэчы, Рэспубліканскі цэнтр займаецца ў тым ліку і пашывам швейных і шорных вырабаў. А таксама тут дзейнічае цэх дрэваапрацоўкі, і ўсё — ад мэблі ў раздзявальнях да бар'ераў для спаборніцтваў — уласнай вытворчасці.

СІМБІЁЗ

Ад таго, як будзе развівацца конегадоўля, залежыць і тое, якія вынікі змогуць паказаць нашы спартсмены.

Але трэба ўлічваць, што добры вынік на спаборніцтвах у такім відзе залежыць не толькі ад коней, якіх трэба вырасціць і падрыхтаваць. Нават пры самых выдатных конях не будзе выніку, калі няма добрых спартсменаў.

Цэнтр у Ратамцы валодае кадрамі, якія могуць працаваць на найлепшыя вынікі. Між іншым, шмат спецыялістаў з Беларусі сёння працуе ў Еўропе.

Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі створаны ў 1996 годзе на базе Рэспубліканскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву і коннага завода імя Л. Даватара. Менавіта дзякуючы таму, што

Запрашаем на вясельную фотасесію.

цэнтр у пасёлку Ратамка застаўся дзяржаўным, тут удалося захаваць і спартыўны цэнтр, і конегадоўлю і дзіцячую школу. Такога аб'яднання ў свеце больш нідзе няма!

Гэты сімбіёз, безумоўна, працуе на карысць спорту: для спартсменаў могуць выбірацца лепшыя коні. У той жа час высокія вынікі, з якімі коні будуць вяртацца са спаборніцтваў, могуць уплываць на развіццё конегадоўлі. Як толькі нейкі конь «выстрэльвае» на спаборніцтвах, вырастае кошт і на яго, і на яго патомства.

— Сёння галоўная задача цэнтра — вынікі ў конным спорце і ў развядзенні коней высокага класа,— заўважае дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі Віктар Міхадзюк. — Я працуюнік таго, што нам няма сэнсу кудысьці лезці: маўляў, нічога не даб'ёмся. Няпраўда! Рэальна ў Еўропе выступаць і перамагаць. Трэба, каб нашы людзі адчувалі, што яны нічым не горшыя за іншых. Так, нашы спартсмены на міжнародных спаборніцтвах занялі пятае месца, і гэта пры тым, што ў пяцёрку ўвайшлі заканадаўцы коннага спорту — Германія, Швецыя, Італія, Францыя. Неабходна мяняць менталітэт. Людзі прызвычаіліся думаць, што ўсё лепшае за мяжой. А ганарыцца трэба сваім. Наш цэнтр гэта даказвае. Так, у час міжнародных спаборніцтваў у Бельгіі конь з Ратамкі стаў першым (!) у кросе.

Прынамсі, як сябе праявяць коні, атрыманыя ў выніку супрацоўніцтва з Германіяй, стане вядома толькі праз некалькі гадоў. А спачатку жарабятам прыйдзецца прайсці праз «садок» і «школу». Заязджаць маладняк пачынаюць толькі ў двухгадовым узросце, і толькі ў 6 гадоў коні могуць пачаць выступаць у вялікім спорце. У гэты час задача спецыялістаў — адабраць добрых, таленавітых коней.

Супрацоўнікі цэнтра кажуць, што добры конь — гэта ўсё роўна як адшліфаваны брыльянт. Вельмі важна, у якія рукі ён трапіць.

У Ратамцы ніколі не дазволяць пакрыўдзіць каня. Тут даглядаюць нават старых коней, якія ўжо не могуць удзельнічаць у спаборніцтвах. Пра кожнага з коней могуць распавядаць гадзінамі. Іх успрымаюць як сяброў. І якое-небудзь малое дзіця, што ідзе і нешта даказвае свайму высокаму капытнаму сябру — тут звычайная з'ява.

Спартсменкі цэнтра ўручаюць прыз у час этапа Кубка свету.

ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ

Маленькім беларусам, якіх у конна-спартыўную школу набіраюць з 9 гадоў, у іншых краінах, дзе такога не захавалася, па-добраму зайздросцяць, бо займаюцца ў Ратамцы дзеці бясплатна. Малыя тут прападаюць цэлымі днямі. Нават падчас летніх канікул маршруткі, што ідуць у ратамскім накірунку, ужо ў 7 гадзін запоўнены юнымі спартсменамі.

Заўважана, што для многіх Ратамка — гэта ўжо як хвароба. Цэнтр дапамагае людзям быць больш шчаслівымі. У стайнях побач з коньмі цэнтра ўтрымліваюцца і хатнія. Прычым з прыватнікаў, якія абзаводзяцца сіўкамі-буркамі, багатых людзей працэнтаў 15-20, а большасць — людзі з сярэднім дастаткам, улюбёныя ў гэтых прыгожых, разумных жывёл.

Сёння Ратамка — гэта не толькі буйны спартыўны цэнтр (тут займаецца 350 спартсменаў і 120 дзяцей). Гэта і культурнае, і аздараўленчае асяроддзе (дзе праводзіцца лячэбная язда для хворых малых). Тут дзейнічае шыкоўная гасцініца, у якой часта праходзяць міжнародныя семінары, працуюць кавярні. У цэнтры праводзяцца экскурсіі. Даволі часта пасля дзіцячых экскурсій ці дзён народзінаў, якія ладзяцца ў цэнтры, паступае шмат званкоў: бацькі жадаюць аддаць дзяцей у конны спорт.

Ёсць у Ратамцы і свая ветэрынарная клініка, спецыялісты якой лечаць не толькі коней (прычым як сваіх, так і прывезеных з розных гаспадарак), але і хатніх гадаванцаў. Аснашчаная найноўшым еўрапейскім абсталяваннем (тут праводзіцца нават ударна-хвалевая тэрапія, робіцца лічбавы рэнтген), яна карыстаецца попытам.

Пастаянна дзейнічае аддзяленне пракату, пакатацца на конях можна нават узімку ў крытым манежы. Таксама сюды можна прыязджаць, каб пазаймацца ў спартыўнай зале. У перспектыве павінен з'явіцца і басейн.

Заязджаюць у Ратамку, як на вясельную фотасесію, так і на сямейны адпачынак. Тут заўсёды ёсць што паглядзець. Амаль кожныя выхадныя праводзяцца спаборніцтвы рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню. Сярод найбольш значных — этапы Кубка свету. Дарэчы, на постсавецкай прасторы Беларусь — адзіная краіна, у якой праводзяцца этапы Кубка свету. Трохборная траса ў Ратамцы лічыцца адной з лепшых у Еўропе. Тое ж самае можна сказаць і пра канкурнае поле. Зараз будуецца сучасны крыты манеж, які здолее ўмясціць больш двух тысяч гледачоў. З яго адкрыццём стане магчымым правядзенне конных спаборніцтваў на працягу ўсяго года. Пакрыццё манежа будзе адпавядаць усім патрабаванням міжнароднай федэрацыі для правядзення конных спаборніцтваў. Тут жа можна будзе ладзіць мерапрыемствы, скіраваныя на папулярызацыю коннага спорту. Ужо сёння цэнтр зможа пры неабходнасці арганізаваць праграму на цэлы дзень. Можна назіраць за канкурам, выездкай альбо ладзіць тэатралізаваныя конныя шоу. Спартсмены цэнтра ўдзельнічаюць у трохбор'і і займаюцца вальтажыроўкай (гэта акрабатыка на конях).

Кажуць, што кожны, хто пабываў тут, вяртаецца зноў і зноў. Не верыце? А вы завітайце ў гэты маляўнічы куток. Дарэчы, ад метро «Каменная горка» (ці са станцыі «Пушкінская») маршруткі ў бок Ратамкі ідуць кожныя 20 хвілін.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота з архіва цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі.

УНП 600049612.

Пасябруем?

З людзьмі і сам-насам

Новыя лісты пра галоўнае

...Што было, тое, кажуць, было: паехалі нашы вясковыя будаўнікі ў Маскву на заробкі. А мову ж рускую больш-менш ведаюць. То вы рашылі «касіць» пад тутэйшых, пад рускіх. Ідуць, між сабою балакаюць. «Ты откуда приехал?» — раптам пытаюць абарыгены ў самага гаварлівага. Той у адказ: «Дык эта... Масквіч я — каранной». Яму ба-бах у вуха. Другому тое ж пытанне. Ён той жа адказ... І тое ж самае атрымлівае. Тады да трэцяга. А той, бядак, уцяміць не можа, за што сябрукоў яго б'юць?! Вуха сваё падставіў і кажа: «На, ляпі ўжо... Як ім, так і мне».

Гэта, як вы здагадаліся, анекдот — з канверта. Як, дарэчы, і чыстая праўда. «Пасля вайны, — піша **спадар Драўніцкі з мястэчка Камарова, што на Мядзельшчыне,** — хлапца з нашай вёскі па вярбоўцы накіравалі ў так званую школу фабрычна-заводскага навучання, а пасля яе — на працу ў Данбас. Так што дамоў на пабыўку ён прыехаў толькі праз пару гадоў... Вяскоўцы, вядома ж, акружылі, пытаюцца:

— Ну, як у тых шахтах? Спускацца не вусцішна?

— Что-что? Я не понимаю, о чем вы спрашиваете, — зморшчыў лоб прыезджы. — Я говорю теперь исключительно по-рюски.

— Гляньце ж вы — адшукаўся... Рюскі ён, — падхапіў хтось з тутэйшых, і ўсе зарагаталі.

ДУМКА З КАНВЕРТА

«Завітаў у родную школу. На ўваходзе дзяжурыць маладая вахцёрка. Пытаюся ў яе:

— Дзе настаўніцкая?

— Что-что? — перапытвае.

— Слова «настаўнік», — пытаюся, — чулі? Ведаеце?

— Да, знаю.

— Дык дзе настаўніцкая?

— Я вас не понимаю.

... Настаўнік — ад слова настаўляць (навучаць, наказваць: у тым ліку, як трэба любіць сваю зямлю, сваю Радзіму).

Чаму ж тады «учат учителя»?»

Валерий ГАЎРЫШ,

г. Чавусы

Фанабэрыстасць з хлапца як рукою зняло — успомніў мову, стаў размаўляць папросту, па-беларуску! Але ж мянушка — «Рюскі» — да яго ўжо прыляпілася, прычым назаўсёды».

Смех — вялікая сіла. І нам абавязкова трэба ёй карыстацца, лічыць чытач, — смяяцца з непісьменнай «рюскай». Можа, хоць так чалавек зразумее, што лепш карыстацца сваёй роднай мовай».

Пра чарговую кранальную сустрэчу з ёй распавядае **спадарыня Кусянкова з Рагачоўшчыны.** «Нагадалі мне назву травы — «пералёт». Пачуць бы і забыцца. Дык жа не — пачала шукаць — у кнігах, у памяці, што гэта такое, бо некалі ж прынясу ў хату **зверабою, можжевельника, девясила, душицы, пустырника, колгана,** а мама (светлай памяці!) і кажа, што гэта — святаяннічак, гэта — ядловец, дзівасіл, мацярынка, серпарэзнік, дуброўка... Яна — перакладала. А я яшчэ і фыркала: цемната, маўляў, навошта гэта рабіць?.. Яна ўсміхалася, як быццам са мной згаджалася, але... у наступны раз зноў перакладала. Можа, упэўнена была ці спадзявалася, што некалі я абавязкова ўспомню словы яе і яшчэ аціаную. Я — успомніла, нехта яшчэ, можа, успомніў... Нехта — не, бо яму не трэба!.. А мо і няма чаго, бо ў сэрцах многіх матуль гэтыя словы ўжо не жывуць. Іх адвучылі ад роднай мовы. І будуць адвучваць далей, бо людзі «бесхрыбетныя», у іх проста няма нейкага стрыжня, яны, — сцвярджае Соф'я Парфір'еўна, — як тая трава на ветры: куды іх хіляць — туды і гнуцца...»

І працягвае тэму траў, бо такі ж дазналася, што пералёт (па-руску язвенник) у іх мясцовасці, апроч іншага... затыкалі пад стрэхі. Тады, лічылася, усе хваробы і беды будуць **пералятаць** праз сялібу, мінаць яе.

А яшчэ з той жа разумнай кніжкі чытачка даведалася, што **тысячалистник** — гэта серпарэзнік, крываўнік, крывапуск, **душица** — мецярынка, мацярдушка, **мать-и-мачеха** — падбел, **фиалка трёхцветная** — браткі, трайцвет, **боярышник** — глог, **окопник** — жывакост, **пустырник** — сардэчнік, **тимьян** — чабор, **валерьян** — грудоўнік, **падарожник** — трыпутнік, бабін цвет, **золототысячник** — цвінтарэй, **василёк** — валошка, хабэрка, шапашнік...

«Нашы, беларускія назвы раслін, у адрозненне ад рускіх, куды больш гавораць аб іх прызначэнні, лекавых якасцях, біялагічных асаблівасцях, знешнім выглядзе і нават магічных здольнасцях. Гэта — не я сказала», — падкрэслівае чытачка.

Што сказала яна? Што сорам, ганьба ў сваёй краіне шукаць сваю мову.

Працяг тых жа думак у лісце **Паўла Мартынеса з Мінска.** «Мяне, як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, вельмі турбуе тое, што з нашых тэлевізійных каналаў амаль поўнасцю знікла беларуская мова, нацыянальнае (!) тэлебачанне краіны ператварылася ў нейкае падабенства расійскага перыферыйнага, а мо нават і горш, бо яно (гэта маё меркаванне) разлічана на гледачоў, якія не маюць ніякай адукацыі...

Чаго, дзякаваць Богу, не скажаш пра наша радыё. Канал «Культура» на ім — гэта наогул цуд, таму, што людзі, якія там працуюць, паважаюць сваіх слухачоў, лічаць іх людзьмі, калі не спрэс адукаванымі (у прывычным разуменні гэтага слова), то ўжо разумнымі — абавязкова».

«Я нічога не маю супраць мовы Пушкіна, Лермантава, Дастаеўскага. Але чаму, — пытае чытач, — мова Багдановіча, Купалы ды Караткевіча павінна быць папялушкай у роднай хаце, а не нашым нацыянальным брэндам?»

Ёсць пытанне, як кажуць. І балючае-балючае.

«Па-беларуску я размаўляю з Богам, калі малюся ў касцёле, на роднай мове чытаю Біблію, — піша Павел напрыканцы свайго ліста. — А тэлевізар часцей за ўсё проста не ўключаю, бо па-нашаму там нічога не перадаюць, а на крымінальныя відовішчы са стралянінай ды крывёю, на тупыя шоу мне проста шкада свайго часу».

Досвед, згадзіцеся, варты пераймання!

Пра яго ж распавядае ў сваім лісце **спадар Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна.**

— Двухмоўе ў нашай краіне — гэта шлях да канчатковай русіфікацыі, да вымірання беларусаў як нацыі, — лічыць ён. І прадбачыць, што некаторыя могуць запярэчыць, сказаць, што ў тым жа Казахстане, маўляў, таксама дзве дзяржаўныя — казахская і руская. Але «...пры гэтым і па-першае, — сцвярджае Міхаіл Паўлавіч, — паміж сабой казахі размаўляюць на роднай мове (яна, казахская, там — жывая...); па-другое, гэта дзве розныя па паходжанні мовы (у нас — дзве блізкія, дзве славянскія); па-трэцяе, у Казахстане працягласць русіфікацыі не была такой вялікай і актыўнай. Руская мова ў іх — як замежная. У нас жа — усё наадварот».

— У СМІ, — працягвае чытач, — паведамлялася, што з 20 вылучэнцаў на пост прэзідэнта Казахстана 8 не пацвердзілі свае веды па роднай мове і... выбылі са спісу кандыдатаў. Гэты досвед варты пераймання і ў нас, у Беларусі. На ўсіх без выключэння пасадах павінны быць людзі, якія ведаюць мову карэннай нацыі...

Пакуль жа, як лічыць шаноўны Міхаіл Паўлавіч, найбліжэйшай задачай па абароне першай (толькі на паперы) дзяржаўнай павінна стаць адкрыццё беларускамоўнага тэлеканала і пераход ВНУ (зноў жа найперш Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта) на выкладанне па-беларуску.

І яшчэ адна першапачатковая «рамантычная» ідэя з гэтага ж канверта. «Як вядома, карыстанне мовай звязана з прывычкай, якая фарміруецца ў дзяцінстве. Дык мо варта ў школах з першага па апошні клас увесці ўрок гутарковай роднай мовы (як факультатыў, хоць бы па 1 гадзіне ў тыдзень) і выкладчыкам гэтага прадмета плаціць 50 % надбаўку?.. Не спяшайцеся пярэчыць, — просіць аўтар ідэі, — што ёсць жа, маўляў, урокі беларускай... Па першае — іх відавочна недастаткова, па-другое, яны носяць, так бы мовіць, акадэмічны характар. Ды і магчымасці настаўніка абмежаваны праграмным матэрыялам. А вось гутарковыя ўрокі могуць быць разнастайнымі па форме (гульні, дыскусіі, тэматычныя паведамленні, абмеркаванне фільмаў, вершаў, баек і г.д.). Да таго ж адзнакі можна не ставіць, бо галоўнае — не яны, галоўнае выхаваць пашану да роднай мовы, паказаць яе мілагучнасць і невычарпальную выразнасць, прывіць гонар за тое, што ты размаўляеш на ёй. Тады выпускнікі (яны ж будучыя бацькі), стварыўшы сем'і, не баяліся б беларускамоўных класаў і школ, навучалі б сваіх дзетак карыстацца родным словам. Ад моладзі залежыць лёс беларусаў як нацыі».

ДУМКА З КАНВЕРТА

«На свяце пісьменства ў Смаргоні бачылі людзей са значкамі, на якіх было напісана: «Гаварыце са мной па-беларуску». Не даведалася, на вялікі жаль, ні хто іх выпусціў, ні якім «накладам»? Трэба разумець, — вельмі невялічкім, бо больш гэтых значкоў нідзе не сустракала. А насіць хацелася б!.. Думаю, у справе адраджэння мовы яны маглі б нам добра паслужыць».

З. ГОЛІКАВА, *г. Мінск*

Апроч таго, «абавязкова трэба падтрымліваць беларускамоўныя выданні. Тую ж «Краязнаўчую газету»: вельмі шмат яна робіць для Беларусі і яе культуры. Але ж пры гэтым на якой паперы выходзіць... Проста сорам і боль... — піша **спадарыня Шыловіч з вёскі Свяціца Ляхавіцкага раёна** і дадае, што трэба (і мэтанакіравана!) падтрымліваць беларускамоўныя раённыя газеты, павялічваць іх тыраж, бо яны таксама праваднікі і абаронцы беларускасці... «Усё гэта можна зрабіць без вялікіх матэрыяльных затрат, — лічыць чытачка, — было б жаданне, была б падтрымка (а не абыякавасць) з боку уладных структур да нашай шматпакутнай беларускай... І тады ў людзей, у нацыі адновіўся б гонар за сваіх продкаў, за сябе, аднавілася б вера ў прыгажосць свайго роднага слова, якое, няхай паступова, але заняло б належнае месца ў жыцці краіны».

І прыкметы гэтага ўжо ёсць. «Расце, шырыцца горад гранітчыкаў Мікашэвічы, — піша **спадар Нефідовіч з Лунінеччыны.**

— І пахвальна, што, даючы назвы новым вуліцам, мікашэўцы не забываюць тых вядомых людзей, лёс якіх звязаны з тутэйшымі мясцінамі. Адну з вуліц назвалі іменем Уладзіслова Нядзведскага. У пасляваенныя гады ён выхоўваўся, а потым працаваў у дзіцячым доме. Імя гэтага паэта і празаіка носіць мясцовая гімназія. Адной з вуліц новага мікрараёна нададзена імя Якуба Коласа. Народны пясняр быў у нашых мясцінах у далёкім 1947-м, балатаваўся у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, прыязджаў на сустрэчу з выбаршчыкамі — тады зусім маладога яшчэ рабочага пасёлка, праявіў клопат аб дзіцячым доме. З лёгкай рукі нашага класіка тут значна папоўнілася бібліятэка, па яго ж хадайніцтве быў куплены грузавы аўтамабіль...».

ДУМКА З КАНВЕРТА

Быў час — спрабавала параўноўваць «Звязду» з іншымі выданнямі. Аднак з гэтага нічога не атрымалася, бо яна проста не параўноўваецца. Ніяк! Як не параўноўваецца родная, матчына мова з іншай, хай і добра засвоенай.

Ірына Ільінічна ЕРМАКОВІЧ,

в. Азяраўцы, Браслаўскі раён

«Скажаце, не вялікае шчасце, што вуліцы названы так, а не іначай? — пытае пасля пісьма Сцяпан Паўлавіч і сам жа адказвае: — Гэта сапраўды не кідалася б у вочы, калі б дагэтуль вуліцам Мікашэвічаў не прысвойвалі гучных імёнаў Горкага, Астроўскага, Маякоўскага... А цяпер, як здаецца, тэндэнцыя змянілася. І ў правільны бок!»

Шмат у пошце і паэтычных радкоў. Прынамсі, Віктар Шыпкоў, курсант Акадэміі МУС прыводзіць наступны дыялог. Маленькая дзяўчынка пытае ў маці, «ці ёсць у нас багацце?». Маці адказвае, што яны маюць волю, за якую «прадзеды падымалі зброю», маюць мову, на якой

«Колькі песень зложана,
Колькі ж іх забыта,
Словы ў іх прыгожыя,
Быццам з аксаміту».
Ёсць яшчэ мінуўшчына:
Не забудзь гісторыю
Краю дарагога.
І зямліцу родную
Ля сваіх парога...
Не зайздросці, сонейка,
На дабро ды скарб,
Няма шчасця, долечкі,
Калі ты ім раб.
Самае ж галоўнае
Трэба зразумець,
Што без мовы роднай
Нам не багацець!»

Вось такія высновы — з новых пісьмаў пра галоўнае. Прычым трапілі ў гэты агляд далёка не ўсе. А значыць, працяг будзе! Пішыце.

Валянціна ДОЎНАР.

Дыскусійная трыбуна — **Погляд**

КАЛІ ЁСЦЬ ЗАКВАСКА

Іншы раз узнікае думка, што сённяшні фінансава-эканамічны крызіс выцякае з нашага маральна-псіхалагічнага стану.

У Асіповічах пачала працаваць ЗПП «Парфюмерна-касметычная фабрыка «Сонца» і на першым этапе пачаўся выпуск пральных парашкоў «Мара». Як бачым, замежнае прадпрыемства носіць беларускую назву, і яе прадукцыя — таксама. Праўда, калі на нейкім стэндзе фігуруе назва фабрыкі, то чамусьці ў «Сонца» імкнуцца ўставіць «л».

Дарэчы, гаспадары «Сонца» хацелі ў свой час выкупіць Баранавіцкі «Бархім», але не сышліся: умовы продажу адштурхнулі пакупнікоў. І вось з'явілася новае прадпрыемства.

Даведаўся, што Баранавіцкі малочны камбінат плануе здзівіць Расію брэндам «Сырная волость» і сырам «Государев». Патэлефанаваў у маркетынгавы аддзел малочнага камбіната і пачуў, што «Сырная волость» яшчэ не брэнд, але прадпрыемства да яго імкнецца, а наконт сыра «Государев» мяне спыталі: « А што ў гэтым кепскага?»

Адноўчы давялося паглядзець фільм мясцовай вытворчасці пра Баранавічы, дык там «государь» паўтараўся разоў сем. Хоць Мікалай II аказаўся нікуды не вартым правіцелем, і хаос, у які пагрузілася Расія, узнік пры гэтым цары невыпадкова, але ж так хочацца быць далучаным ...

А чаму не «Сырны край»? Воласць — гэта адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў царскай Расіі. Для чаго гэтыя выверты? Колькі назваў мог бы мець сыр — сваіх, адметных, якія пакупнік запомніў бы. Галоўнае, каб сыр быў якасным.

Пры вырабе сыру ў Баранавічах выкарыстоўваюць закваскі нямецкай, дацкай і польскай вытворчасці. Можа, уся праблема ў тым, што ў нас няма сваёй закваскі?

Ёсць і станоўчыя прыклады. Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў выкарыстоўвае брэнд «Гаспадар», і ён красуецца па ўсім горадзе, і не толькі. А ў маршрутных гарадскіх аўтобусах аб'явы робяць па-беларуску. І гэты факт звязаны з пазіцыяй кіраўнікоў прадпрыемстваў Наталлі Манько і Мікалая Пучко.

На нарадзе ў Ганцавічах, калі абмяркоўваўся ход падрыхтоўкі да Дня пісьменства, каля аднаго з будынкаў узнікла пытанне: на якой мове будзе надпіс.

Адзін з ведамасных мясцовых начальнікаў сказаў, што надпіс будзе на рускай мове, бо на гэтай мове зацверджаны брэнд. Затым высветлілася, што прадугледжаны і беларускі варыянт. Але чыноўнік не здаваўся. Маўляў, мы выбралі на рускай. І гэта пры тым, што віцэ-прэм'ер краіны Анатоль Тозік, які прысутнічаў на нарадзе, падкрэсліў неабходнасць як мага шырэй выкарыстоўваць да Дня пісьменства родную мову.

Нядаўна ў Пружанах дэпутаты раённага Савета далі назву дзевяці вуліцам горада. І ў райцэнтры з'явіліся вуліцы: Изумрудная, Янтарная, Жемчужная, Лучистая, Звёздная, Радужная, Светлая, Майская, Дружная.

Што нясуць у сабе гэтыя назвы? А нічога! Поўная абязлічанасць. А калі яшчэ назву вуліцы напісаць па-беларуску, як «Лучыстая» — то далей ехаць няма куды.

Выйшаў на старшыню раённага Савета дэпутатаў Віктара Макарэвіча.

— Віктар Мікалаевіч, як у вас прымаецца рашэнне па наданні вуліцам назвы?

— *Архітэктурны савет пры Пружанскім райвыканкаме выносіць прапанову на выканкам, а адтуль яна перадаецца раённаму Савету дэпутатаў.*

— Назвы дзевяці вуліц, якія зацвердзілі вашы дэпутаты, выклікаюць сумненне: яны абязлічаныя.

— *Наша раёнка ўжо падымала гэтае пытанне. Ну і што? Я даў адказ. І што ў тых назвах кепскага? Наадварот, людзі дзякуюць. Вось мне адна жанчына сказала: «Як хораша жыць на вуліцы Ізумруднай, а то ўсё Інтэрнацыянальныя... Вы там дыктафон уключылі? Бывайце здаровы!»*

Цікава, а ці быў у тым архітэктурным савеце хоць адзін краязнаўца ці філолаг?

Я ні ў якім разе не за тое, каб нашы вуліцы абавязкова насілі імёны славутых гістарычных асоб Беларусі, хоць гэта было б і добра. Але ж можна даць назвы, якія напомняць чалавеку, у якой краіне ён жыве, да якой нацыі належыць.

Як будзе называцца ў райцэнтры вуліца ці прадукцыя на прадпрыемстве, ніхто зверху не камандуе — усё вырашаецца на мясцовым узроўні. А тут ужо наколькі ведаў хопіць і «закваскі».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВУЛІЦЫ ІВАНА ХРУЦКАГА І ГЕНАДЗЯ ЦІТОВІЧА З'ЯВІЛІСЯ Ў МІНСКУ

Вуліцы вядомых беларускіх дзеячаў мастацтваў Івана Хруцкага і Генадзя Цітовіча з'явіліся ў Мінску. Рашэнне аб іх назве прыняў Мінгарсавет, паведаміла БЕЛТА начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталіна Рудзікава.

Іван Хруцкі, імем якога названа праектуемая вуліца нумар 5, працаваў у жанры нацюрморта, партрэта, пейзажа, інтэр'ера ў традыцыях акадэмічнай школы жывапісу. У Беларусі 2010 год праходзіў пад знакам 200-гадовага юбілею мастака. Яго імя ўнесена ў спіс выдатных дзеячаў культуры ЮНЕСКА.

Імем дырыжора і дзеяча харавога мастацтва, заснавальніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля песні і танца Генадзя Цітовіча будзе названа праектуемая вуліца нумар 16. Ён запісаў больш за 3 тыс. беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх, балгарскіх, літоўскіх, латышскіх народных песень і танцаў. Унёс значны ўклад у станаўленне і развіццё самадзейнага музычнага мастацтва Беларусі.

Віталіна Рудзікава адзначыла, што Мінгарсавет таксама прыняў рашэнне аб найменні 14 састаўных частак сталіцы — вуліц, праездаў, завулкаў. Так, 4-е транспартнае кальцо на ўчастку ад праспекта Дзяржынскага да пуцеправода праз чыгунку Мінск — Брэст названа вуліцай Чурлёніса — вядомага літоўскага мастака і кампазітара канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Мікраараёну, размешчанаму побач з Даўгінаўскім трактам, прысвоена назва мікрараён Даўгінаўскі.

У Мінску з'явіліся таксама вуліцы паэта, празаіка і перакладчыка Уладзіміра Дубоўкі, беларускага і літоўскага мастака Пятра Сергіевіча, беларускага і польскага пісьменніка, аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры Яна Баршчэўскага, пісьменніка, вучонага і дзяржаўнага дзеяча Івана Навуменкі.

Акрамя таго, атрымалі назвы безыменныя праезды, на якіх няма будынкаў: вуліца Вірская, Дачны праезд, Геалагічны і Каралінскі праезды, Лесапаркавая вуліца, праезд Дразды, Свіслацкі і Інжынерны завулкі.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Ганцевичский р-н, д. Шашки, ул. Советская, 28
Продавец недвижимого имущества	РУП «Белтелеком», тел.: (0162) 20 28 88, (01646) 2 12 31
Сведения о предмете аукциона	Здание одноэтажное с холодной пристройкой, кирпичное, 1979 г.п., площадь – 136,6 кв.м. Земельный участок площадью 0,05 га использовать для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли, услуг; срок аренды – 30 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	109 980 745
Сумма задатка, руб.	10 990 000
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by***

Аукцион состоится **15 июля 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – **по 14 июля 2011 г. включительно.**

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Консолидированным участником – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

7. Уполномоченным лицом консолидированного участника (его представителем) – доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

8. Представителем заявителя, уполномоченного лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель), уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 14 июля 2011 года включительно.

ИНФОРМАЦИЯ о проведении повторного аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

Адрес объекта и его наименование	**Ангар 2**, расположенный по адресу: Минская обл., Узденский р-н, п. Смолзавод, общая площадь 240 м². **Начальная цена: 25 434 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 15 % от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис»
Сумма задатка	10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис»
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Вилейском районном исполнительном комитете
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-Сервис»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Конечный срок и адрес приема заявок	**29.06.2011 г. до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения аукциона	**30.06.2011 г. в 15.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис»

ЗАГАРЭЎСЯ ДОМ — ЗАГІНУЛІ ДВОЕ

Дом па вул. Азёрнай у Баранавічах здымалі 7 кватарантаў (4 хлопцы і 3 дзяўчыны). А 4 гадзіне раніцы двухпавярховы драўляны будынак загарэўся. Агонь быў настолькі моцным, што пачаў плавіцца сайдынг на суседнім доме. Калі прыехалі пажарныя, то другі паверх ужо быў моцна пашкоджаны. Пры тушэнні там знайшлі два трупы. Загінулі жыхары Віцебскай вобласці 23 і 24 гадоў — яны працавалі ў Баранавічах. Адна з дзяўчат выскачыла з другога паверха і пазней з цяжкімі апёкамі была дастаўлена ў бальніцу. Астатнія кватаранты пакінулі дом яшчэ да прыезду работнікаў МНС. Прычына пажару ўстанаўліваецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Не зарэгіструешся на ЦТ своечасова?
ПРАПУСКАЙ ЦЭЛЫ ГОД...

Ці можна зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне тым, хто спазніўся зрабіць гэта да 1 чэрвеня? Ці можна падаваць дакументы адначасова ў дзве ВНУ? Ці праўда, што сёлета будзе скарочана колькасць бюджэтных месцаў? Які дакумент можна ўзяць на ЦТ, калі пашпарт знаходзіцца на адкрыцці візы? Ці можна ўзяць ільготны крэдыт для атрымання другой вышэйшай адукацыі на платнай аснове, калі першую вышэйшую адукацыю дзяўчына аплачвала без прыцягнення крэдыту? Ці будзе арганізавана падчас правядзення ЦТ медыцынскае суправаджэнне, улічваючы спякотнае надвор'е, і што рабіць, калі абітурыент адчуе сябе падчас экзамену дрэнна? Ці дадуць яму дадатковы час для заканчэння тэставай работы? Гэтыя і іншыя пытанні прагучалі падчас «прамой лініі», якую правёў у Камітэце дзяржкантролю старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных спытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах Анатоль РУБІНАЎ. У «прамой лініі» ўзялі ўдзел таксама міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Раіса САЎРЫЦКАЯ і начальнік галоўнага ўпраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю Ала МІКАЛУЦКАЯ.

Як ні дзіўна, але кожны год знаходзіцца да некалькі дзясяткаў маладых людзей, якія не зарэгістраваліся на цэнтралізаванае тэсціраванне ў вызначаныя дні. Тлумачэнні гучаць самыя розныя: не ведаў, забыўся, пераблытаў, хварэў, знаходзіўся за межамі краіны і гэтак далей. Як прызнаўся Мікалай Фяськоў, у пачатку чэрвеня, пасля завяршэння рэгістрацыі, такія «забыўлівыя» штодня тэлефануюць у Інстытут кантролю ведаў з просьбамі ўвайсці ў іх становішча і дазволіць ім зарэгістравацца. З просьбамі зрабіць для іх дзіцяці выключэнне звярталіся бацькі абітурыентаў і на «гарачую лінію» дзяржаўнай камісіі. Маўляў, шкада губляць цэлы год і чакаць наступнай прыёмнай кампаніі...

— На жаль, але мы нічым дапамагчы не можам, прычым па шэрагу прычын... Па-першае, сёлета ва ўсіх пунктах рэгістрацыі на ЦТ дзейнічала аўтаматызаваная сістэма рэгістрацыі ўдзельнікаў тэсціравання, якая працавала па прынцыпе «аднаго акна». Самая важная перавага аўтаматызаванай сістэмы заключалася ў тым, што абітурыентам цяпер не трэба самастойна шукаць свабоднае пасадачнае месца, больш таго, можна завітаць у пункт рэгістрацыі ў адным горадзе, а праходзіць тэсціраванне — у іншым. Аднак 1 чэрвеня пасля закрыцця пунктаў рэгістрацыі аўтаматызаваная сістэма была адключана. І ўнесці ў гэту базу нейкія дадатковыя звесткі пра новых удзельнікаў ЦТ ужо фізічна немагчыма. Калі б была магчымасць туды яшчэ нешта ўносіць уручную, то гэта стварыла б глебу для нейкіх злоўжыванняў, — патлумачыў Анатоль Рубінаў. — Але гэта толькі тэхнічны бок пытання. Не варта забывацца, што тэрміны правядзення рэгістрацыі занатаваныя ў правілах прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, якія зацвярджаюцца Указам Прэзідэнта нашай краіны, і мы проста не маем права іх парушаць. Задача дзяржаўнай камісіі — сачыць за захаваннем усіх вызначаных працэдур, арганізацыяй і правядзеннем тэсціравання, працэсам праверкі экзаменацыйных работ і працэдурай залічэння, а не парушаць вызначаныя правілы. Ёсць, для прыкладу, расклад руху цягнікоў ці самалётаў. І калі чалавек па нейкай прычыне спазняецца на цягнік, няхай і па самай уважлівай, ніхто ж не вяртае цягнік назад на станцыю. І таму, хто спазніўся, не прыходзіць у галаву скардзіцца, а даводзіцца чакаць іншага цягніка. Тое ж і з рэгістрацыяй на тэсціраванне. Спазніўся — чакай наступнай прыёмнай кампаніі. Напэўна, прэтэндэнтам на атрыманне вышэйшай адукацыі трэба больш адказна ставіцца да паступлення, трэба разлічваць свой час і не цягнуць з наведваннем пунктаў рэгістрацыі. Безумоўна, не ўсе жыццёвыя сітуацыі можна прадбачыць. Магчыма, у будучыні мы паспрабуем прапісаць у дакументах прычыны, якія б дазвалялі абітурыентам зарэгістравацца з дазволу дзяржаўнай камісіі і пасля 1 чэрвеня. Такой уважлівай прычынай, напрыклад, можа быць працяглая хвароба абітурыента, з-за якой той не змог наведваць пункт рэгістрацыі на працягу цэлага месяца, ці знаходжанне спартсмена за мяжой на міжнародных спаборніцтвах. Але разгільдзяйства і забыўлівасць мы дакладна заахвочваць не будзем.

Падаваць дакументы ў дзве ВНУ адначасова немагчыма, паколькі прыёмныя камісіі прымаюць толькі арыгіналы дакументаў аб адукацыі. Можна падаць дакументы ў адну ВНУ, а калі стане зразумелым, што конкурсная сітуацыя развіваецца не на тваю карысць, забраць іх і падаць дакументы або на іншую спецыяльнасць, або ў іншую ВНУ. Балазе, інфармацыя аб конкурснай сітуацыі будзе абнаўляцца кожныя тры гадзіны. Апошні раз — за тры гадзіны да закрыцця прыёмных камісій.

— Падчас правядзення цэнтралізаванага тэсціравання абавязкова будзе наладжана дзяжурства медыцынскіх работнікаў, — заспакоіў Мікалай Фяськоў. — І хоць абітурыентам не дазваляецца праносіць на тэсціраванне ваду, у аўдыторыях вада будзе прысутнічаць абавязкова, але на асобных століках... У тым выпадку, калі самаадчуванне абітурыента рэзка пагоршыцца, гэты факт абавязкова павінен засведчыць медыцынскі работнік. З медыцынскай даведкай абітурыенту будзе дадзена магчымасць перадзадць гэту дысцыпліну ў рэзервовы дзень. Але падоўжыць тэрмін выканання тэставай работы арганізатары, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, не маюць права.

На тэсціраванні абавязкова трэба мець з сабой дакумент, які сведчыць асобу ўдзельніка ЦТ: гэта можа быць пашпарт, від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца ці даведка органаў унутраных спраў, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента. Тлумачэнні кшталту «мой пашпарт у пасольстве» пад увагу брацца не будуць. Вадзіцельскае пасведчанне таксама для праходжання тэсціравання не падыходзіць.

— Гэта не наш капрыз, — тлумачыць Мікалай Фяськоў. — Пералік дакументаў, якія сведчаць асобу грамадзяніна, зацверджаны не нашым інстытутам, а ўказам кіраўніка дзяржавы. Да таго ж, калі вы плануеце сёлета паступаць, то павінны вырашыць загадзя, што для вас больш важна: гарантаваны летні адпачынак, замежная камандзіроўка з адкрытай візай ці здача экзаменаў у ВНУ? Чаму абітурыенты напярэдадні тэсціравання аддаюць свой пашпарт у пасольства, турфірму ці вырашаюць яго нарэшце абмяняць у пашпартным стале? Няўжо кагосьці прапусціць за мяжу з пратэрмінаваным пашпартам ці па вадзіцельскім пасведчанні? Дык адкуль такое несур'ёзнае стаўленне да прыёмнай кампаніі?

Адну дзяўчыну, што патэлефанавала на «прамую» лінію, цікавіла, што ёй рабіць: 10 мая яна зарэгістравалася на ЦТ, а 21 мая ўзяла шлюб, перайшла на прозвішча свайго мужа.

— Ідзіце на тэсціраванне з тым пашпартам, з якім праходзілі рэгістрацыю, — параіў Мікалай Фяськоў. — А ўжо пасля заканчэння тэсціравання, пакуль будуць правярацца тэставыя работы, можаце памяняць свой пашпарт у пашпартным стале, а мы выпішам вам сертыфікаты ўжо на прозвішча мужа. Ці нават калі не паспееце памяняць свой пашпарт да выпіскі сертыфікатаў, мы можам памяняць вам сертыфікаты з дзявочым прозвішчам на сертыфікаты з новым прозвішчам да заканчэння тэрміну падачы дакументаў у ВНУ.

Міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, у сваю чаргу, заспакоіў: «Істотнага скарачэння бюджэтных месцаў у гэтым годзе ў ВНУ не адбудзецца. Па маіх звестках, на 600 месцаў у агульнай суме скароціцца набор у чатырох медыцынскіх універсітэтах. І хоць урачоў сёння ва ўстановах аховы здароўя не хапае, у галоўным медыцынскім ведамстве падлічылі, што кадравую праблему яны змогуць закрыць за кошт павялічанага набору, які адбываўся ў папярэднія гады. А ў іншых ВНУ адбудзецца пераважна пераразмеркаванне бюджэтных месцаў паміж спецыяльнасцямі і профілямі. З улікам неабходнасці нарошчвання высокатэхналагічных і навукаёмістых галін будзе павялічвацца прыём на тэхнічныя, тэхніка-тэхналагічныя і прыродазнаўчанавуковыя спецыяльнасці. Што тычыцца магчымасці ўзяць льготны крэдыт на атрыманне вышэйшай адукацыі на платнай аснове, то такая магчымасць даецца толькі адзін раз. І калі першую вышэйшую адукацыю чалавек аплачваў самастойна, ці ўвогуле навучаўся на бюджэтнай падрыхтоўцы, то ў яго ёсць магчымасць скарыстацца дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе льготнага крэдыту падчас атрымання другой ці трэцяй вышэйшай адукацыі».

Сяргей Маскевіч таксама запэўніў, што ў пачатку жніўня да залічэння на платную форму навучання ва ўсіх ВНУ будзе адначасова аб'яўлены кошт навучання на будучы навучальны год, каб абітурыенты і іх сем'і маглі прымаць рашэнне з улікам сваіх фінансавых магчымасцяў. Сёння перад ВНУ паставлена задача — аптымізаваць свае выдаткі. Працэдура вызначэння кошту навучання — абсалютна празрыстая. У рублёвым эквіваленце кошт навучання можа падрасці ў межах 20 працэнтаў. На адных спецыяльнасцях павышэнне кошту можа скласці і 4—5 працэнтаў, а на іншых — і 11, і 15 працэнтаў. Натуральна, што пры сваіх разліках ВНУ будуць абапірацца на эканамічныя рэаліі і фінансавы стан беларускіх сем'яў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Звязацца з прадстаўнікамі дзяржаўнай камісіі па кантролі за арганізацыяй і правядзеннем уступных іспытаў можна па тэлефонах «гарачай» лініі Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і яго тэрытарыяльных органаў:

Рабочая група дзяржаўнай камісіі (017) 227 66 80
Брэсцкая абласная камісія (0162) 21 00 33; 23 16 90
Віцебская абласная камісія (0212) 37 33 90; 36 44 95
Гомельская абласная камісія (0232) 70 16 38; 70 18 00
Гродзенская абласная камісія (0152) 74 52 72; 77 04 47
Мінская абласная камісія (017) 284 06 96; 284 07 06
Магілёўская абласная камісія (0222) 22 11 84; 22 18 97; 31 07 75
«Гарачая» лінія Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (017) 222 43 12

Вучні пабывалі на складзе

Невядомыя сарвалі навясны замок з дзвярэй склада, які знаходзіўся на тэрыторыі мехдвара ААТ «Ганцавіцкі райагрэсэрвіс», і ўкралі радыятар ад трактара «МТЗ», дзве помпы для паліва, зварачны кабель... Злачынцамі аказаліся два вучні сярэдняй школы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Уступная кампанія ў жаночым інстытуце «Энвіла» пройдзе без змяненняў

Ніякіх змяненняў у час уступнай кампаніі адносна прыёму абітурыентаў у прыватную ўстанову адукацыі «Жаночы інстытут «Энвіла» не будзе. Аб гэтым расказаў БЕЛТА міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч.

Паводле слоў міністра, інфармацыя, распаўсюджаная некаторымі СМІ аб тым, што інстытут не будзе праводзіць набор абітурыентаў у гэту ўступную кампанію, не адпавядае рэчаіснасці. «Кантрольныя лічбы прыёму ў ВНУ Беларусі былі ўзгоднены загадзя, і ніякіх змяненняў у парадку прыёму абітурыентаў не будзе», — падкрэсліў Сяргей Маскевіч.

Уступная кампанія ў Беларусі праходзіць па адзіных правілах прыёму, зацверджаных кіраўніком дзяржавы. У гэтым годзе абітурыентаў будуць набіраць 55 ВНУ.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Тумба на судне для мацавання каната, троса		Арктычная ластаногая жывёліна		Палявая спаравая расліна	Інертны газ (Kr)	Прыправа для ежы — агародная расліна	Птушка; тое, што і сіваграк	Лекавая расліна з аранжавымі кветкамі (календула)
				Паўднёвыя японскія астравы				
Драўляны хамут для вала		Спосаб выйсці, вышыўкі				Адзіночны баявы карабель	Камплект колаў для вагона	
				Бытавы электрапрыбор				
Рабочы конь-цяжкавоз	Слабарніцтва паміж дзвюма камандамі		Перадача думак на адлегласці	Род аптычнага шкла	Саматканая спадніца		Лугавое насякомае	
								Лацінскае імя Адысея
	Трохструнны музычны інструмент		Вялікая рака ў Індыі і Пакістане				Горад-герой у РФ	
	Т.зв. бамбукавы мядзведзь						Горад на Сахаліне	У спорце: асобная група каманд
	Птушка, т.зв. лясны жаўранак		Раніш-ні або вячэрні ваенны сігнал			Тое, што і паслён		Краіна на паўднёвым захадзе Азіі
Дробныя каляровыя пацеркі	Электрапале ў тканках арганізма		Пярэдняя частка галавы чалавека	Кінарэжысёр і сцэнарыст («Трывожная маладосць», «Бег» і інш.)				Украіна Тыбецкага нагор'я

Палявая кветка з белымі пялёсткамі

6				8	7		2	
		2			3		7	
				9		5		3
					9			7
		4				2		
3			5					
4		6		3				
	3		8			4		
	7		6	1				5

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Здарэнне

НА МІНСКІМ МОРЫ ПЕРАКУЛІЛАСЯ ЯХТА

Здарэнне адбылося ноччу 11 чэрвеня. Каля 2.30 пры здзяйсненні павароту ў 1,3 кіламетра ад берага рулявы не справіўся з кіраваннем, і яхта перакулілася. Адбылося гэта ў раёне пасёлка Ратамка, каля прыпыначнага пункта «Мінскае мора» Беларускай чыгункі.

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, у яхце знаходзіліся пяцёра: тры мужчыны і дзве дзяўчыны. Самы малады з хлопцаў прыняў рашэнне самастойна дабірацца да берага. Яго калегі па няшчасці засталіся сядзець на дне перакуленага судна (матор-парус «Крэветка»). Ужо з берага малады чалавек выклікаў экстранныя службы. Пазней ён сеў у лодку выратавальнікаў і паказаў ім месца «караблекрушэння». На дзвюх лодках пасажыры яхты былі дастаўлены на бераг. Па словах медыкаў, ніхто з іх не меў патрэбы ў шпіталізацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АДКАЗЫ
на сканворд + судоку
На гарызанталі: Кнехт. Крыптон. Ямо. Рэчка. Шво. Матч. Пласт. Конік. Багажніка. Іна. Тупа. Панама. Ліга. Юпа. Зара. Іран. Тэар. Сыта. Алаў. Кам. Бітоўка. Рамонак. **На вертыкалі:** Біцюг. Бісер. Нерпа. Тапенатыя. Хвошч. Ліпка. Крон. Анадарак. Рэйдар. Ліснік. Ракша. Ака. Сжат. Улюс. Ліцвін. Арата. Наротка. Анам. **Судоку:** адказы гл. у тэлепраграме.

14 чэрвеня

Дзве даты

1941 год — Вярхоўнае галоўнакамандаванне ўзброеных сіл Германіі аддае апошнія распараджэнні аб нападзе на СССР. У той жа дзень распаўсюджана заява ТАСС аб савецка-германскіх адносінах, у якой гаворыцца, што «па звестках СССР, Германія гэтак жа няўхільна прытрымліваецца ўмоў савецка-германскага пакта аб ненападзе, як і Савецкі Саюз, а таму, на думку савецкіх колаў, чуткі аб намеры Германіі парваць пакт і прадпрыняць напад на СССР не маюць ніякай асновы».

1928 год — нарадзіўся Эрнеста Рафаэль Гевара дэ ла Серна (Чэ Гевара), лацінаамерыканскі рэвалюцыянер, міністр прамысловасці ва ўрадзе Фідэля Кастра, сімвал сусветнага левага руху. Прозвішча Чэ атрымаў ад іспанскага выклічніка Che, які часта выкарыстоўваў у сваёй гаворцы. Вядомы ва ўсім свеце двухколерны партрэт Чэ Гевары анфас створаны ірландскім мастаком Джымам Фіцпатрыкам з фотаздымка кубінца Альберта Корды 1960 года. На берэце рэвалюцыянера зорачка Хосэ Марці, адрозны знак камандантэ, атрыманы ад Кастра разам з гэтым званнем у 1957 годзе.

Цытата дня:

«Калі чалавек не адкрыў для сябе нешта такое, за што ён гатовы памерці, ён не здольны паўнацэнна жыць».

Марцін Лютэр Кінг (1929-1968), адзін з кіраўнікоў барацьбы за грамадзянскія правы чарнаскурага насельніцтва ЗША.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.43	17.06
Віцебск —	4.18	21.41	17.23
Магілёў —	4.27	21.33	17.06
Гомель —	4.33	21.20	16.47
Гродна —	4.54	21.56	17.02
Брэст —	5.04	21.47	16.43

Месяц

Поўня 15 чэрвеня. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Веры, Валяр'яны, Дзяніса, Харытона, Усціна.*

К. *Элізы, Эльвіры, Юстыны, Базыля, Валерыя, Міхала.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні

ТРЫ ЦЭНТРЫ ХАТНЯЙ ПРАСТОРЫ

Вертыкальная структура жылля таксама была падзелена на тры адпаведныя ўзроўні. Хата ўяўляла сабою мікрамадэль бясконцага Сусвету, у якой верхні ярус прыналежаў вярхоўным багам, ніжні — нашым продкам і хтанічным істотам, а сярэдні — чалавеку. Верхняя частка — дах, гарышча — лічылася месцам рассялення духаў (адгэтуль духавае акно — маленькае акенца пад дахам хаты). Калі ў паўсядзённым жыцці бэлькі выконвалі розныя дапаможныя ролі — падвесіць зыбку, падвязаць жэрдку, на якой будзе сушыцца адзенне, — то ў абрадавых сітуацыях менавіта столь станавілася мяжой, якая раздзяляла гэты свет з тым светам. Так, калі чалавек доўгі час знаходзіўся ў стане агоніі і не мог памерці, то мужчыны выбівалі адну-дзве дошкі ў столі, каб душы было лягчэй пакінуць цела і гэты свет.

● Ніжняя частка хаты, уключаючы парог, падпечак і склеп (падмосце, пограб), лічылася месцам пахавання продкаў. Пазней ніжнюю частку хаты сталі выкарыстоўваць для захоўвання бульбы і іншай гародніны. Менавіта ў ніжнім гарызонце хаты пасля родаў закопвалі плацэнту («след», «дзіцячае месца»): каля парога, «абы-дзе, на вуліцы» — пасля нараджэння дзяўчынкі (каб сышла за парог — выйшла замуж), паблізу ад чырвонага кута — пасля нараджэння хлопчыка (каб прывёў нявесту і пасадзіў за вясельны стол).

● Такім чынам, звычайная вясковая хата, якая ў першую чаргу павінна была абараніць чалавека ад холаду, дажджу, снегу і ветру, стварыць умовы для камфортнага існавання, паступова ператваралася ў своеасаблівы цэнтр светабудовы, у якім пераважалі духоўныя каштоўнасці. Хата станавілася своеасаблівым храмам сям'і, месцам нараджэння чалавека і месцам яго смерці. Хата — гэта не толькі мадэль свету, але і сама светабудова.

● Такім чынам, у процілеглым баку ад парога заўсёды быў чырвоны кут, па дыяганалі ад чырвонага кута ў хаце была печ, якую абавязкова бялілі ў белы колер.

● Свет славянскай хаты аб'ядноўваў тры асноўныя рытуальныя цэнтры: чырвоны кут — печ — парог. Сыходзячы з хаты, чалавек кланяўся чырвонаму куту (пры гэтым печ абавязкова закрывалі засланкай), а затым кланяўся роднаму парогу і сыходзіў у белы свет. За межамі гэтага свету ён сутыкаўся з іншым Сусветам — светам свайго Селішча. Але і гэты свет трымаўся на тых жа трох кітах.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Мама:

— З сённяшняга дня мы посцім. Мы з бацькам, разам:

— А чаго гэта ты пра сябе ў множным ліку?

☺

Я заўсёды па матэматыцы ўраўненні рашаў хутка, а мой сусед па парце — правільна.

☺

Вася спіць спакойна, таму што ён заплаціў усе падаткі. Пеця спіць спакойна, таму што ў яго спіць сумленне. А калі няма розніцы, то навошта тады наогул аддаваць грошы?

☺

Хлопец з сяброўкай едуць у аўтамабілі, іх спыняе даішнік:

— Вы выехалі на сустрэчную паласу, правы канфіскуюваю.

Хлопец:

— А ты іх купляў, каб адбіраць?!..

☺

Мяркуючы па тым, што гараджане ядуць на сваіх дачах, вырошчваюць яны на іх толькі шашлык!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2798. Нумар падпісаны ў 19.30 13 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12